Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
12 чэрвеня 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 113 (29227)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА



ЧАМУ ТОНУЦЬ НАШЫ ДЗЕЦІ? 5

КУПЛЯЙ У ІНТЭРНЭТ-КРАМАХ І... НЕ ГУБЛЯЙ МС



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, віцэ-прэм'ер:**

*«У нас створана адпаведная група, якая павінна з улікам бягучай сітуацыі па каранавірусе адпрацаваць неабходныя метадалагічныя рэкамендацыі для санаторна-курортных устаноў і турыстычных кампаній, якія будуць займацца як уязным, так і выязным турызмам. Гэтыя прапановы нашай санітарнай службай падрыхтаваныя. Разам з тым лібералізацыя падыходаў, у тым ліку па самаізаляцыі, не павінна пагоршыць сітуацыю з захворваннем на каранавірус. Усё гэта кіруецца, пад кантролем, тут не павінна быць ніякіх асцярог, што мы нешта рабілі ці робім не так».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Наш шлях — абсалютна той, якім павінны былі ісці ўсе дзяржавы»

### Трэба спадзявацца, што другой хвалі COVID-19 не будзе, але рыхтавацца да яе неабходна



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў учора з міністрам аховы здароўя Уладзімірам Каранікам пытанні гатоўнасці айчыннай сістэмы аховы здароўя да магчымай другой хвалі эпідэміі новага каранавіруса.**

Прэзідэнт адзначыў, што цяпер у свеце шмат размоў пра магчымасць другой хвалі пандэміі.

«Так, пакуль не зусім гэта ясна, зразумела, але калі другая хваля, то наш шлях — абсалютна той шлях, якім павінны былі ісці ўсе дзяржавы», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Магчымасць другой хвалі абмяркоўваецца цяпер на ўсіх узроўнях, адзначыў журналістам міністр па выніках сустрэчы з лідарам краіны. У прыватнасці, Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць, што яна непазбежная.

«Пытанне толькі ў тым, наколькі яна будзе цяжкая і наколькі закране нармальную жыццядзейнасць грамадства», — сказаў Уладзімір Каранік.

СТАР. 2

# У двары з сонейкам



Фота БелТА.

**У Гродне педагогі дадатковай адукацыі арганізуюць на канікулах забаўляльныя і гульнявыя праграмы ў дварах жылых дамоў. Некалькі разоў на тыдзень педагогі цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі «Спектр» і «Прамень» будуць прыязджаць у двары ў спальных раёнах горада і праводзіць майстар-класы, гульні і забаўляльныя праграмы для дзяцей рознага ўзросту. Стартавай лакацыяй акцыі стаў двор на вуліцы Церашковай. Дзецям прапанавалі забавы на любы густ: рухомыя і актыўныя гульні, танцы, канструктары, баталії ў шахматы і шашкі, майстар-класы па рукадзеллі і маляванні.**

## КОРАТКА

- **Адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі з Сі Цзіньпінам.**
- Урад прапрацоўвае павышэнне працоўных пенсій па ўзросце.
- **Амерыканская нафта пачала паступаць на «Нафтан».**
- Прыёмная кампанія ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі стартуе 15 чэрвеня.
- **Урад Беларусі прапанаваў РФ зняць абмежаванні на турпаездкі.**
- Адзінае ў Японіі дзіцяня барханнага ката пакажуць публіцы ў заапарку Насу.



- **Беларусь атрымала ад ПРААН медвырабы на суму $10 тыс.**

Тэхналогіі

# Электрапаліва для машыны

### У нашай краіне яно ў два разы таннейшае, чым бензін. А тарыфы на зарадку электрамабіляў будуць самыя нізкія ў Еўропе

**У Беларусі скончыўся першы, тэставы этап стварэння сеткі электразаправачных станцый, калі зарадзіць электрамабіль можна было бясплатна. З ліпеня «Беларуснафта» ўводзіць тарыфы на зарадку на ЭЗС Malanka. У кампаніі падкрэсліваюць, што цана электраэнергіі будзе самая нізкая ў параўнанні з суседзямі і іншымі еўрапейскімі краінамі. Яна складзе каля 30-40 капеек за 1 кВт•г, і залежаць канчатковая цана будзе ад хуткасці зарадкі: «заправіцца» на суперхуткай станцыі выйдзе крыху даражэй. Але ў любым выпадку гэта будзе амаль у два разы танней, чым выкарыстоўваць бензін.**

СТАР. 4




Фота БелТА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Наш шлях — абсалютна той...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак ён выказаў надзею, што другой хвалі не будзе, бо шэраг экспертаў кажа пра гэта.

«Але рыхтавацца да яе трэба абавязкова, — падкрэсліў міністр. — Зноў жа, асноўныя захады, якія рэкамендуюцца, — адсочваць кантакты першага ўзроўню (тое, што мы з самага пачатку рабілі ў нашай краіне), быць гатовым да аказання медыцынскай дапамогі хворым (тут у нас таксама няма праблем) і быць гатовым да ўвядзення пэўных абмежаванняў (у нас і зараз пэўныя абмежаванні дзейнічаюць, але неабходнасці больш жорсткіх мы не бачым, бо не маем прыкмет перагрузкі сістэмы аховы здароўя)».

Уладзімір Каранік заўважыў, што інстынкт самазахавання ў беларусаў зніжаецца, таму зноў нагадаў пра базавыя прынцыпы: неабходнасць мыць рукі, захоўваць сацыяльнае дыстанцыяванне, берагчы сябе і найбольш уразлівыя катэгорыі грамадзян, якім рэкамендавана пазбягаць месцаў масавага збору людзей.

«У цэлым мы бачым, што добрае надвор'е і павышэнне актыўнасці нашых грамадзян пакуль негатыўна не адбіваюцца на эпідэміялагічнай сітуацыі», — дадаў міністр.

На просьбу журналістаў ацаніць эфектыўнасць абранага Беларуссю шляху барацьбы з пандэміяй Уладзімір Каранік адказаў наступным чынам: «Поўныя параметры эфектыўнасці можна будзе ацаніць, калі эпідэмія скончыцца: будуць праведзены папуляцыйныя даследаванні, выяўлена колькасць людзей, якія маюць імунітэт, падлічаны паказчыкі лятальнасці... Калі браць статыстычныя паказчыкі, па колькасці выкананых тэстаў на мільён жыхароў мы ўваходзім у дзясятку першых краін свету. Паказчыкі лятальнасці ў нас адны з найлепшых. І асноўнае — мы не дапусцілі перагрузкі сістэмы аховы здароўя».

Па словах міністра, у беларускіх рэаніматолагаў ніколі не было цяжкага выбару: каго з пацыентаў падключаць да апарата ШВЛ.

«Нават у самы актыўны перыяд эпідэміі ў нас было задзейнічана менш за 15 працэнтаў ад парку наяўных апаратаў ШВЛ», — паведаміў ён.

Але асноўная перавага абранага беларускай дзяржавай шляху, па словах міністра, у тым, што такія мерапрыемствы могуць праводзіцца доўга пры мінімальным умяшанні ў жыццядзейнасць людзей.

«І калі нехта нас папракае тым, што іншыя краіны, у адрозненне ад нас, ратавалі не эканоміку, а людзей, то нас гэта крыўдзіць. Мы таксама ратавалі людзей. Толькі пачалі рабіць гэта раней. Калі захавалі санітарна-эпідэміялагічную службу і пастаянна яе развівалі — мы захоўвалі людзей, а не эканоміку. Бо многія лічылі эканамічна немэтазгодным утрымліваць такую моцную службу, таму што чалавецтва ўжо не бачыць эпідэмій халеры, брушнога тыфу, чумы і іншых захворванняў, якія раней забіралі вельмі шмат жыццяў».

Па словах Уладзіміра Караніка, гэта датычыцца і захавання ложкавага фонду ў бальніцах.

«Нас цяжка параўноўваць са многімі заходнімі краінамі, бо ў нас іншая сістэма аховы здароўя, — дадаў міністр. — У нас іншыя падыходы. І наша сістэма дазваляла ісці гэтым шляхам і не рабіць цяжкі выбар: ратаваць людзей або эканоміку».

Што датычыцца гатоўнасці да другой хвалі эпідэміі, то пасля аналізу вузкіх месцаў, магчымых рызык сістэма аховы здароўя краіны стварае запасы сродкаў індывідуальнай аховы, пашырае магутнасці спецыялізаваных лабараторый, працягвае абнаўленне сістэм кіслароднай падтрымкі, дыягнастычных магчымасцяў.

«Падпісана дамова з Сусветным банкам, вядуцца перагаворы з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам пра закупку і тамографаў, і машын хуткай дапамогі», — праінфармаваў Уладзімір Каранік.

Міністр таксама падзяліўся думкай, што ў Беларусі дастаткова значная колькасць людзей мае спецыфічны імунітэт, дзякуючы чаму можна прагназаваць другую хвалю эпідэміі менш цяжкай, чым першая.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

На слыху

# ДВУХТЫДНЁВЫ КАРАНЦІН АДМЯНЯЕЦЦА

## Гэта датычыцца тых, хто прыязджае ў Беларусь з большасці еўрапейскіх краін

**У Беларусі скарацілі спіс краін, пасля прыезду з якіх трэба знаходзіцца два тыдні ў самаізаляцыі. У пералік увайшлі многія краіны Еўропы. А ў беларусаў, якія накіроўваюцца за мяжу, з'явілася магчымасць прайсці платнае ПЛР-даследаванне на COVID-19 не толькі ў Мінску, але і ў абласных цэнтрах.**

Такім чынам, са спіса, вызначанага пастановай Савета Міністраў ад 25 сакавіка 2020 года № 171 «Аб мерах па прадухіленні завозу і распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай каранавірусам COVID-19», выключаны Албанія, Аўстрыя, Балгарыя, Бельгія, Боснія і Герцагавіна, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Ісландыя, Іспанія, Італія, Латвія, Літва, Ліхтэнштэйн, Люксембург, Мальта, Малдова, Манака, Нарвегія, Польшча, Партугалія, Паўночная Македонія, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чарнагорыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія, Кітай.

— Асобы, якія прыбылі з указаных краін, цяпер не абавязаны знаходзіцца ў самаізаляцыі цягам 14 дзён з моманту прыбыцця ў Беларусь, — паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя. — Пры гэтым замежныя грамадзяне, якія прыбываюць у Беларусь, абавязаны мець пры сабе пры перасячэнні граніцы даведку на англійскай мове з адмоўным вынікам ПЛР-даследавання, якое выканана не раней чым за двое сутак да даты перасячэння граніцы.

Раней, нагадаем, грамадзяне гэтых краін пасля прыбыцця ў Беларусь павінны былі правесці ў самаізаляцыі 14 дзён.

Тым часам беларусы, якія збіраюцца за мяжу, могуць цяпер праходзіць ПЛР-даследаванне на наяўнасць COVID-19 на платнай аснове не толькі ў Мінску, але і ў абласных цэнтрах. Іх выконваюць, акрамя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя і Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, Брэсцкі, Віцебскі, Гомельскі, Гродзенскі, Мінскі, Магілёўскі абласныя цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, а таксама Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.

Нагадаем, што для грамадзян Беларусі такі аналіз каштуе 41,38 рубля, для нерэзідэнтаў — 56,63 рубля. Ахвотным прайсці даследаванне варта мець з сабой копію пашпарта і копію білетаў у тую краіну, куды яны выязджаюць. Даведка выдаецца на рускай і англійскай мовах.

*Па звестках на 11 чэрвеня ў Беларусі зарэгістравана 51 816 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. Папраівіліся і выпісаны 26 643 пацыенты, за ўвесь перыяд распаўсюджвання інфекцыі памерла 293 чалавекі. Праведзена 678 570 тэстаў. Прырост за суткі новых выпадкаў аказаўся мінімальны за апошнія паўтара месяца — 750. 976 пацыентаў выпісаны. Пацярых выратаваць не ўдалося. За апошнія суткі праведзена 19 005 тэстаў, гэта таксама рэкордная лічба — максімальная з пачатку распаўсюджвання інфекцыі.*

**Алена КРАВЕЦ.**

Блізкая ўлада

# ЖЫЛЛЁ, ДАРОГІ І ЖКГ

**З такімі пытаннямі звярталіся на прамую лінію да памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Івана ЛАЎРЫНОВІЧА, якую ён правёў у Дзятлаўскім райвыканкаме.**

Яму тэлефанавалі жыхары не толькі Дзятлаўскага, але і іншых раёнаў вобласці. У цэнтры ўвагі былі пытанні рамонту і будаўніцтва дарог, жылля, работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Па выніках не толькі цяперашняй, але і іншых прамых ліній падкрэслю, што кіраўнікам, спецыялістам сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі трэба больш уважліва ставіцца да людзей і іх праблем. Многія пытанні маглі б быць вырашаны на месцах, а не выносіцца на ўзровень аблвыканкама ці Адміністрацыі Прэзідэнта, — адзначыў Іван Лаўрыновіч. Ён падкрэсліў: такія прамыя лініі ў раёнах дапамагаюць лепш выяўляць пытанні, якія неабходна вырашаць больш аператыўна менавіта на месцах.

Дарэчы, адзін зварот быў нават з Магілёўскай вобласці. Заяўніца хвалявалася за сваіх бацькоў, якія жывуць у пасёлку Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна. Жанчына паскардзілася, што каторы год у доме, дзе знаходзіцца кватэра пенсіянераў, не выконваецца капрамонт.

Памочнік Прэзідэнта адзначыў: зварот будзе ўзяты на кантроль. Са старшынёй райвыканкама абмяркоўвалася магчымасць таго, каб сёлета ці ў наступным годзе прыняць канкрэтнае рашэнне: перасяліць людзей ці капітальна адрамантаваць іх дом.

Па ўсіх зваротах дадзены адказы і тлумачэнні, выкананне шэрагу даручэнняў узята на кантроль.

**Паводле БелТА.**

# «ТРЭБА ШЫРЭЙ РАЗГОРТВАЦЬ БУДАЎНІЦТВА АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ»

## Аляксандр Лукашэнка ўхваліў праект пастановы ўрада «Аб грамадзянах, якія маюць першачарговае права на атрыманне арэнднага жылля»

**Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што адна з ключавых задач, якая стаіць перад урадам на пяцігодку, — развіццё рэгіёнаў. «А развіццё рэгіёнаў без сацыяльнай сферы немагчыма, — падкрэсліў ён. — Урачы, настаўнікі — нашы дзяржаўныя «штыкі». На іх трымаецца не толькі іх прафесійная работа, але мы іх часта прыцягваем да рознага кшталту іншых дзяржаўных мерапрыемстваў».**



Фота БелТА.

**Дом для медыкаў у Бараўлянах Прэзідэнт назваў узорам арэнднага жылля для бюджэтнікаў.**

Каб не кінуць апірышча дзяржавы пасля важных дзяржаўных кампаній (змаганне з пандэміяй — у іх ліку), і прымаюцца захады па забеспячэнні работнікаў сацыяльнай сферы жыллём.

«Мы ўжо вызначаліся з вамі і маем узоры такіх дамоў, глядзелі іх у Бараўлянах, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да прысутных, у тым ліку віцэ-прэм'ера Ігара Петрышэнкі, які быў дакладчыкам па гэтым пытанні. — Недарагія, вельмі зручныя. Такім чынам мы можам вырашыць кватэрныя пытанні для маладых урачоў і настаўнікаў».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што пабудову такога жылля нельга назваць стратным праектам.

***«Трэба шырэй разгортваць будаўніцтва арэнднага жылля, і пажадана, каб яно было ў прыярытэце, асабліва для небагатых нашых настаўнікаў, урачоў, работнікаў культуры,*** — запатрабаваў беларускі лідар. — І гэта перш за ўсё датычыцца нашых рэгіёнаў. Ды і ў Мінску ў нас нямала праблем па гэтых спецыялістах».

Пры гэтым важна, каб падыход пры вызначэнні платы за арэнду быў прадуманы, акцэнтаваў Прэзідэнт.

«Які эфект, самае галоўнае, мы атрымаем ад падобнага рашэння? — спытаў распрацоўшчыкаў дакумента кіраўнік дзяржавы. — ***Эфект павінен быць адзін — людзі павінны працаваць, яны павінны замацоўвацца па месцы гэтага жыхарства, жыць і працаваць у сваёй краіне. Працаваць эфектыўна»***.

Па словах Ігара Петрышэнкі, цяпер з агульнай колькасці арэнднага фонду (148 453 жылыя памяшканні) заселена больш за 92 працэнты.

Пастанова «Аб грамадзянах, якія маюць першачарговае права на атрыманне арэнднага жылля» ахоплівае ўсіх работнікаў бюджэтнай сферы, растлумачыў журналістам віцэ-прэм'ер, падводзячы вынікі размовы з Прэзідэнтам.

«Каб падтрымаць катэгорыю людзей, якія атрымліваюць фіксаваны заробак, кіраўнік дзяржавы, калі наведваў пасёлак Лясны (Бараўлянскага сельскага Савета ў Мінскім раёне. — **«Зв.»**), дзе быў пабудаваны дом арэнднага жылля — інтэрнат для ўрачоў, сказаў, што нам трэба па гэтым шляху рухацца, — нагадаў Ігар Петрышэнка. — У развіццё яго даручэнняў была падрыхтаваная адпаведная пяцігадовая праграма, яна зацверджана ўрадам. На падставе прапаноў аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама мы дакладна вызначылі, колькі, дзе, у якіх населеных пунктах павінна быць пабудавана арэнднага жылля для работнікаў, у тым ліку сацыяльнай сферы».

У чарзе на такое жыллё знаходзіцца больш за 5 тысяч такіх работнікаў, праграма прадугледжвае будаўніцтва звыш 2,5 тысячы арэндных кватэр для іх.

Для атрымання арэнднай кватэры павінен быць заключаны кантракт не менш чым на пяць гадоў, дадаў віцэ-прэм'ер. Яшчэ адна акалічнасць — спецыяліст павінен быць запатрабаваны ў гэтай мясцовасці.

Сёлета плануецца пабудаваць каля 1000 квадратных метраў арэнднага жылля, акрамя таго, больш за 10 тысяч «квадратаў» жылля, якое пустуе, будзе адрамантавана, магчыма, з удзелам патэнцыйных арандатараў.

Кошт арэнды дзяржаўнага жылфонду залежыць ад населенага пункта і катэгорыі памяшкання. З улікам паніжаючых каэфіцыентаў, якія прапаноўвае праект пастановы ўрада, кошт арэнды двухпакаёвай кватэры ў Мінску складзе да 35 рублёў (без уліку камунальных плацяжоў), паведаміў віцэ-прэм'ер.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

З першых вуснаў

# «ХАЦЕЛАСЯ Б БАЧЫЦЬ ГЭТЫ ІНСТЫТУТ ЯК ЦЭНТР, ДЗЕ КАНЦЭНТРУЮЦЦА КЛАСНЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ І НАЙНОЎШЫЯ ТЭХНАЛОГІІ»

## У Беларусі хутка з'явіцца новая навучальная ўстанова

**Яе задача — на навуковай аснове рыхтаваць першакласных следчых. Учора Прэзідэнт абмеркаваў са старшынёй Следчага камітэта Іванам Наскевічам стварэнне Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Беларусі.**

Злачынствы, раскрыць якія няпроста, існавалі ва ўсе часы. Але эпоха, у якую мы з вамі жывём, характэрная тым, што крымінал усё больш сыходзіць у сферу высокіх тэхналогій. І каб выкрыць такіх злачынцаў, патрэбны спецыяльныя веды. Да гэтага часу ў Беларусі няма навучальных устаноў, якія рыхтуюць спецыялістаў у галіне расследавання камп'ютарных правапарушэнняў, — гэтым пакуль займаецца Следчы камітэт. Але ўжо ў найбліжэйшы час чакаецца падпісанне ўказа кіраўніка дзяржавы, які зменіць сітуацыю.

«Актуальная тэма, — пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка. — ***Ад следства патрабуецца больш якасці, больш веданў... Аператыўнасць вельмі патрэбная.*** І хацелася б бачыць гэты інстытут не проста як навучальную ўстанову, дзе дадуць нейкія веды, а каб гэта быў у вас цэнтр, дзе канцэнтруюцца класныя спецыялісты і найноўшыя тэхналогіі».

Падводзячы вынікі абмеркавання гэтага пытання з кіраўніком дзяржавы, Іван Наскевіч потым дадаў журналістам: «У рамках інстытута мы плануем праводзіць вялізны аб'ём работы па ўніфікацыі следчай практыкі, па метадычным забеспячэнні следства на цалкам іншым узроўні, па ўвядзенні навуковага складніка. Плануем займацца экспартам адукацыйных паслуг».

### Эфект прафілактыкі

Будучы Інстытут павышэння кваліфікацыі следчых стаў адной з тэм даклада Івана Наскевіча кіраўніку дзяржавы. Акрамя яго, былі абмеркаваны вынікі работы ўсіх праваахоўных органаў за пяць месяцаў гэтага года. «Узровень злачыннасці ў параўнанні з мінулым годам зменшыўся практычна на 13,5 працэнта», — праінфармаваў Іван Наскевіч. ***Такіх тэмпаў зніжэння злачыннасці ў краіне не было даўно***, заўважыў Прэзідэнт. «***Думаю, што гэта вынік той планамернай вялізнай работы прафілактычнага характару ўсяго праваахоўнага блоку і ў цэлым дзяржаўных органаў***, бо раней або пазней гэта павінна было выявіцца», — лічыць старшыня СК.

Другая асаблівасць сённяшняга часу — змяненне структуры злачыннасці.

«Рэзка вырасла колькасць злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій, — растлумачыў журналістам Іван Наскевіч. — Іх доля сёння складае 12 працэнтаў, гэта вельмі шмат, і гэтая доля расце штогод. Гадоў 6—7 таму такія злачынствы складалі каля двух працэнтаў, гэта значыць рост у шэсць разоў».

У сферу высокіх тэхналогій сыходзяць злачынствы, якія да нядаўняга часу мелі статус агульнакрымінальных, напрыклад такія, як вымагальніцтва і махлярства.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### Гучныя справы

Старшыня СК далажыў таксама пра крымінальныя справы, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта, і пра грамадска значныя, буйныя злачынствы, якія расследаваў Следчы камітэт. У прыватнасці, пра вынікі расследавання па факце забойства маладой жанчыны ў Мінску, часткі цела якой знайшлі ў рацэ ў цэнтры горада.

Па словах Івана Наскевіча, расследаванне крымінальнай справы завершана і накіравана пракурору для перадачы ў суд, злачынства раскрыта, вінаватая асоба выкрыта.

Кіраўнік дзяржавы таксама быў праінфармаваны пра вынікі расследавання крымінальнай справы па факце разбойнага нападу на ювелірную краму «Яхант».

«У рамках расследавання ўстаноўлена некалькі эпізодаў злачыннай дзейнасці групоўкі з трох чалавек, — расказаў старшыня СК. — Яны, акрамя разбойных нападаў, кралі зброю. Трываласць групы і мэтанакіраванасць яе дзеянняў дазволілі кваліфікаваць тое, што яны здзейснілі, як бандытызм. Ім прад'яўлены абвінавачанні ў тым ліку па артыкуле 286 Крымінальнага кодэкса Беларусі».

Іван Наскевіч заўважыў, што ў нашы дні гэта досыць рэдкае абвінавачанне — апошні раз справа па гэтым артыкуле накіроўвалася ў суд каля пяці гадоў таму.

Вядзенне згаданай крымінальнай справы скончана, цяпер пачынаецца стадыя азнаямлення абвінавачаных з матэрыяламі крымінальнай справы. Мяркуецца, што цягам будучага месяца яна таксама будзе накіравана пракурору для перадачы ў суд.

«Акрамя таго, Прэзідэнт праінфармаваны пра ўмовы здзяйснення дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося ў Барысаўскім раёне, у выніку якога загінулі шэсць чалавек, у тым ліку трое непаўналетніх, — працягнуў Іван Наскевіч. — Адной з прычын, на думку следства, з'яўляецца адсутнасць загараджальнай канструкцыі паміж сустрэчнымі палосамі руху. Такога роду аварыі — з выездам на сустрэчную паласу руху і гібеллю людзей — сталі нярэдкімі».

Па словах старшыні СК, кіраўнік дзяржавы пагадзіўся, што прыйшоў час змяняць заканадаўства, якое датычыцца тэхнічных умоў, будаўнічых нормаў і правіл, каб хоць пры рэканструкцыі хуткасных магістраляў знаходзіць сродкі на ўсталяванне загараджальных канструкцый паміж палосамі сустрэчнага руху.

Цэнтральным апаратам Следчага камітэта працягваецца расследаванне крымінальнай справы, якая была заведзена па артыкуле 364 Крымінальнага кодэкса Беларусі па факце выкарыстання гвалту ў адносінах да супрацоўніка органаў унутраных спраў у Гродне падчас пікета па зборы подпісаў у рамках перадвыбарчай кампаніі, расказаў журналістам старшыня СК.

«Цяпер гэтая крымінальная справа перакваліфікаваная ў частку 1 артыкула 342 Крымінальнага кодэкса Беларусі «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак». Прад'яўлены абвінавачанні і абраная мера стрымання ў адносінах 10 асоб», — заявіў Іван Наскевіч.

Старшыня СК дадаў, што ідзе планавая, спакойная работа па фіксацыі супрацьпраўных дзеянняў і зборы доказаў. «Колькі чалавек у выніку будзе прыцягнута да крымінальнай адказнасці, я пакуль не скажу, магчыма, іх будзе больш, магчыма — менш, — удакладніў ён. — Расследаванне паказвае, што ў ініцыятыўнай групе было каля паўсотні асоб судзімых, больш за дзясятак наркаразова судзімых, якраз усе яны і з'яўляюцца фігурантамі гэтай крымінальнай справы. Следства працягваецца. Як толькі будзе атрымана інфармацыя, якая задаволіць грамадскі інтарэс, мы праінфармуем усіх пра яго вынікі».

Парламенцкі дзённік

# ЭКАНОМІКА Ў НОВАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

## На чарговым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў акрамя разгляду законапраектаў дэпутаты далі згоду на назначэнне прэм'ер-міністрам Рамана Галоўчанкі

**Згодна з Канстытуцыяй пасля прызначэння кіраўніка ўрада Прэзідэнтам за кандыдатуру павінны прагаласаваць дэпутаты. Рамана Галоўчанку прадставіў дэпутатам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка.**


Фота БелТА.

### Першыя задачы абноўленага ўрада

«Не адзін год ён займаў кіраўнічыя пасады ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце, таму не па чутках ведае работу арганізацый рэальнага сектара эканомікі, разумее, як рашэнні ўрада непасрэдна ўплываюць на дзейнасць канкрэтных прамысловых прадпрыемстваў», — заўважыў кіраўнік Адміністрацыі, прадстаўляючы новага прэм'ера.

Задачай для ўрада, па словах Ігара Сергеенкі, з'яўляецца пабудова эканамічнай палітыкі ва ўмовах сучаснай рэальнасці.

«У нас ёсць усё неабходнае для годнага пераадолення любых негатыўных наступстваў. Сфарміраваны ўрад павінен быць гатовы аператыўна рэагаваць на магчымыя выклікі і рызыкі, прымаць рашэнні ў інтарэсах людзей усёй краіны, а таксама несці за іх адказнасць», — дадаў ён.

Прэм'ер-міністр выказаўся аб мэтах, якія пастаўлены перад Саветам Міністраў. Галоўная з іх — дасягненне ўстойлівага збалансаванага эканамічнага росту з тэмпамі вышэй сярэдняга. Сярод асноўных задач, акрамя таго, на думку Рамана Галоўчанкі, — абарона ўнутранага рынка, дыверсіфікацыя рынкаў збыту за кошт канкурэнтаздольнасці айчынных тавараў, павышэнне эфектыўнасці кіравання прадпрыемствамі з дзяржаўнай уласнасцю.

«У нас няма пакуль неабходнай колькасці свабодных кіраўнікоў адпаведнай кваліфікацыі. Неабходна ўнікаць і прымаць рашэнні па ўсіх праблемных арганізацыях дзяржаўнай уласнасці. Скажу, што мой асабісты вопыт работы па Аршанскім рэгіёне пацвярджае, што магчыма і ў ручным рэжыме выводзіць прадпрыемствы на траекторыю развіцця», — сказаў прэм'ер-міністр.

Бюджэтныя сродкі павінны, па яго словах, выкарыстоўвацца перш за ўсё для вырашэння сацыяльных задач і стварэння інфраструктуры для развіцця бізнесу, прыцягнення інвестыцый, заснавання новых рабочых месцаў.

«Ва ўмовах новай рэальнасці, пераходу эканомікі да сусветных цэн на энерганосьбіты і пастаяннай знешняй пагрозы наша першасная задача — пазбавіць эканамічную сістэму ад вуглевадароднай і іншай кан'юнктурнай залежнасці, выкараніць сістэмны дысбаланс, забяспечыць устойлівае развіццё эканомікі і дынаміку росту дабрабыту грамадзян. Гэтыя і іншыя задачы знойдуць сваё адлюстраванне ў будучай праграме дзейнасці ўрада», — падкрэсліў прэм'ер.

### Насустрач рэстараннаму бізнесу

Палата прадстаўнікоў у першым чытанні ўзгадніла змены ў закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання». Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч расказаў, што навацыі выкліканы неабходнасцю спрашчэння патрабаванняў для вядзення бізнесу ў гэтых сферах.

«У прыватнасці, прадугледжваецца пераход на паведамляльны прынцып пачатку работы гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання праз унясенне звестак у гандлёвы рэестр, самастойнае вызначэнне рэжыму работы гандлёвых аб'ектаў, стварэнне стацыянарных гандлёвых аб'ектаў грамадскага харчавання, гандлёвых цэнтраў незалежна ад наяўнасці схем размяшчэння, якія распрацоўваюць і зацвярджаюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы», — паведаміў Уладзімір Калтовіч.

Рэгулюецца законапраектам самастойны разлік сеткамі сваёй долі ў аб'ёме рознічнага абароту ў межах тэрытарыяльных адзінак, арганізацыя і правядзенне кірмашоў выканкамамі, магчымасць фізічных асоб рэалізоўваць продаж на рынках кандытарскіх, хлебабулачных і іншых вырабаў.

У мэтах адзінай палітыкі размяшчэння нестацыянарных і перасоўных гандлёвых аб'ектаў урад выпрацуе іх адзіны пералік.

Аляксандр Бабаловіч, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве звярнуў увагу на ўвядзенне ў закон паняцця кейтэрынгу.

«Увядзенне такога тэрміну было абумоўлена тым, што гэты від грамадскага харчавання атрымаў шырокае распаўсюджанне ў нашай краіне. Сутнасць яго ў тым, што аб'ект грамадскага харчавання вырабляе прадукцыю пад заказ і дастаўляе яе заказчыку. Таксама гэты аб'ект харчавання можа не толькі вырабляць і дастаўляць прадукцыю, але і абслугоўваць гасцей на мерапрыемстве», — удакладніў парламентарый.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Блізкая ўлада

# АБЛВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкарanення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 13 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ.
Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС.
Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ.
Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК.
Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН.
Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ.
Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ.
Тэл. 8 017 222 44 44.

# Электрапаліва для машыны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Увядзенне платы за выкарыстаную электраэнергію абмяркоўвалася ўжо з 2018 года, калі «Беларуснафта» ўказам Прэзідэнта стала нацыянальным аператарам па стварэнні сеткі ЭЗС. Аднак было прынята рашэнне адкласці ўвядзенне тарыфікацыі да 2020 года, — расказвае **намеснік дырэктара аб'яднання Андрэй КОЦІК**. — На сённяшні дзень можна сказаць, што пачатковы этап развіцця сеткі электразаправачных станцый у краіне мы паспяхова завяршылі.

Malanka з'явілася і працуе ва ўсіх рэгіёнах і на ўсіх магістралях: да цяперашняга моманту ўсталявалі больш за 260 ЭЗС. Гэтага дастаткова для абслугоўвання тысяч электрамабіляў. І мы лагічна пераходзім да наступнага этапу — эканамічна абгрунтаванага развіцця сеткі. Malanka — гэта не проста адна станцыя, а нацыянальная сетка, якая пакрывае ўсю краіну. А гэта значыць, што разам з хуткасцю і якасцю абслугоўвання кіроўцы атрымліваюць упэўненасць у тым, што не застануцца без электраэнергіі для свайго аўтамабіля. Гэта агульнасусветная практыка: нават фірменныя зарадныя станцыі Tesla, якія першапачаткова ў перыяд станаўлення таксама былі бясплатныя, цяпер аказваюць паслугу за грошы.

Па словах прадстаўніка «Беларуснафты», электрапаліва ўсё роўна будзе значна таннейшае за бензін. Просты падлік паказвае, што поўная зарадка электракара Nissan Leaf, ёмістасць батарэі якога 24 кВт•г, абыдзецца яго ўладальніку ў 7-9 рублёў у залежнасці ад хуткасці зарадкі. Гэтага запасу энергіі хопіць, каб праехаць 150 кіламетраў. Расход паліва на такую ж адлегласць для аналагічнага аўтамабіля з бензінавым рухавіком складзе прыкладна 10 літраў паліва, якія будуць каштаваць каля 18—20 рублёў.

Такая розніца ў цане розных відаў паліва дазволіць зрабіць электратранспарт больш прывабным у параўнанні з бензінавымі аўтамабілямі. У апошнія месяцы ў краіне прыняты шэраг мер, каб стымуляваць пераход на экалагічны транспарт: адменены ПДВ і мытная пошліна, што сур'ёзна зменшыла кошт куплі электрамабіля для фізічных і юрыдычных асоб.

Пры гэтым заправіцца на станцыях Malanka будзе значна танней, чым у іншых еўрапейскіх краінах, дзе парк электрамабіляў большы, чым у нас. Дапусцім, у Германіі падзарадзіць той самы Nissan Leaf абыдзецца прыкладна ў 20 рублёў. Зрэшты, у еўрапейскіх дзяржавах няма адзінай цаны на зарадку, яна можа вар'іравацца ў залежнасці ад брэнда ЭЗС, ад месца размяшчэння станцый, ад хуткасці зарадкі і іншых фактараў. Шматлікія кампаніі, напрыклад, бяруць плату за час, які патрабуецца для зарадкі электрамабіля, а не энергію.

Параўнальна нізкую цану на электрапаліва, па прагнозах спецыялістаў, атрымаецца ўтрымліваць у будучыні дзякуючы атрыманню электраэнергіі з Беларускай АЭС.

Аплаціць зарадку можна будзе з дапамогай спецыяльнай праграмы. Цяпер у «Беларуснафце» ёсць праграмны прадукт для аплаты паліва, выкарыстоўваючы які, кіроўцы могуць запраўляцца хутка і бескантактава. У хуткім часе будзе запушчаны падобны і для электразаправак. Ён будзе называцца гэтаксама, як і сетка. Праз тую праграму можна будзе не толькі здзейсніць аплату, але і адсочваць параметры зарадкі электракара: колькі кілават зараджана, за які час, на якую адлегласць іх хопіць. Акрамя таго, у праграме можна будзе забраніраваць зарадку і ўбачыць размяшчэнне найбліжэйшых станцый, што таксама значна спросціць жыццё ўладальнікам электракараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# ХАЛОДНЫ «ТОМАС» НАС АСТУДЗІЦЬ, АЛЕ НЕНАДОЎГА

## На выхадных амаль паўсюдна будуць кароткачасовыя дажджы і тэмпература знізіцца на 4—8 градусаў

**Яшчэ ў красавіку аналітыкі ад надвор'я абяцалі нам суперспякотнае лета. Потым быў халодны май, пасля якога многія да доўгачасовыя прагнозы проста махнулі рукой. А дарма. Паводле звестак сіноптыкаў, пад уплывам субтрапічнага паветра ў краіне ўсталявалася вельмі цёплае надвор'е. У сераду ў разгар дня тэмпература паветра склала плюс 26—34 градусы, а ў Мінску было 32 цяпла. На некаторых метэастанцыях, у тым ліку ў сталіцы, быў перавышаны рэкорд дня.**

**Але сітуацыя ў атмасферы пачынае змяняцца. У Беларусі ў выхадныя месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Уся справа ў тым, што над скандынаўскім паўвостравам набірае сілу халодны антыцыклон «Томас». Адціскаючы на поўдзень анамальна цёплае паветра, ён прынясе паслабленне спякоты і аднаўленне звычайнага чэрвеньскага тэмпературнага рэжыму ў краіне. Такім чынам, у суботу тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 15 да плюс 21 градуса, па поўначы краіны — 13—14 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 19—26 цяпла, а ў паўднёвых раёнах — ад плюс 27 градусаў да плюс 30. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Вецер будзе паўночна-заходні ўмераны, удзень парывісты.

У нядзелю «Томас» на ўсю сілу «расправіць плечы», а прахалода будзе прабівацца далей на поўдзень. У гэты дзень тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 11—17 градусаў, а ўдзень — 16—23 цяпла . Але па паўднёвым усходзе краіны ўначы чакаецца ад плюс 18 да плюс 19 градусаў, а ўдзень у гэтым рэгіёне паветра прагрэецца да 24—27 цяпла. Уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі рэгіёна чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, заходні парывісты.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня паўночна-ўсходні вецер зменіцца на паўднёва-заходні, і тэмпература зноў пачне павышацца. У панядзелак чакаецца пераменная воблачнасць. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя часы ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 11 да плюс 18 градусаў, удзень чакаецца 20—26 цяпла. У паўднёва-ўсходнім рэгіёне паветра ў дзённыя часы прагрэецца да плюс 29 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Кантакт

# ПІШЫЦЕ ПІСЬМЫ Ў «ВЯЛІКІ КАМЕНЬ»!

## Учора ў Беларуска-Кітайскім індустрыяльным парку адкрылася новае высокатэхналагічнае аддзяленне паштовай сувязі

**На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця новага аддзялення сувязі «Вялікі камень» прысутнічала кіраўніцтва Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, РУП «Белпошта», мясцовай улады і ўласна Індустрыяльнага парка.**




Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган падчас урачыстай цырымоніі адзначыў, што для прадпрыемства РУП «Белпошта» адкрыццё новага аддзялення паштовай сувязі — гэта выдатная падзея. Развіццё інфраструктуры ў такім стратэгічна важным і унікальным месцы, як індустрыяльны парк «Вялікі камень», — гэта адзін з важных кірункаў развіцця нашай краіны. «Мы спадзяёмся, што з выкарыстаннем новых тэхналогій, з добрасумленнай працай нашых работнікаў аддзяленне будзе мець эканамічную эфектыўнасць», — сказаў міністр.

Генеральны дырэктар СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» спадар Янь Ган акцэнтаваў увагу на тым, што развіццё індустрыяльнага парка «Вялікі камень» перайшло ад будаўніцтва да функцыянавання. Праект парка развіваецца пад асабістай увагай лідараў Беларусі і Кітая. Сёлета «Вялікі камень» пераходзіць ад этапу будаўніцтва да этапу высокатэхналагічнай вытворчасці. Тут ужо зарэгістравана звыш 60 прадпрыемстваў-рэзідэнтаў, і аб'ём заяўленых інвестыцый перавышае 1170 мільёнаў долараў ЗША. У будучыні гэтае месца стане смарт-індустрыяльным горадам-спадарожнікам, павялічыцца колькасць людзей, якія будуць тут жыць і працаваць. Таму адкрыццё новага аддзялення сувязі зробіць свой унёсак у развіццё і асваенне парка людзьмі. Пад кіраўніцтвам Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі тут паступова ўкараняецца тэхналогія 5G. У будучыні «Вялікі камень» працягне супрацоўніцтва з РУП «Белпошта».




**Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.**

# Калі не «пракаціла» з работай...

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы затрыманы 40-гадовы гараджанін, які скраў электрасамакат коштам каля 1700 рублёў.**

У міліцыю звярнулася адміністрацыя гандлёвага аб'екта, які рэалізуе спартыўныя тавары, з заявай аб тым, што невядомым быў выкрадзены электрасамакат, выстаўлены ў вітрыне ў якасці ўзору.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікамі быў затрыманы 40-гадовы афіцыйна не працуючы мінчанін. Выкрадзенае было знойдзена па месцы жыхарства падазраванага, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

Высветлілася, што мужчына незадоўга да здарэння прыходзіў у названую краму ўладкоўвацца менеджарам па продажах. Зрабіць гэта ў яго не атрымалася. Праз некалькі дзён з таго ж гандлёвага аб'екта ён выкраў электрасамакат.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Дзярждоўг ЗША дасягнуў 26 трыльёнаў долараў



Пра гэта паведамляе тэлеканал CBS News са спасылкай на Міністэрства фінансаў ЗША. У ведамстве звязваюць гэты рост з дзеяннямі ўлад па барацьбе з пандэміяй каранавіруса. А ў цэлым, па звестках Мінфіна, за час прэзідэнцтва Дональда Трампа дзярждоўг вырас на шэсць трыльёнаў долараў. Раней колішні кіраўнік ведамства Генры Полсан папярэдзіў, што бескантрольны рост дзяржаўнага доўгу і бюджэтны дэфіцыт могуць пазбавіць долар прывілеяванага становішча ў якасці асноўнай сусветнай рэзервовай валюты.

## Lufthansa мае намер скараціць 26 тысяч рабочых месцаў

Lufthansa і профільныя прафсаюзы авіяперавозчыка вядуць перамовы, якія датычацца планаў кіраўніцтва кампаніі скараціць не менш за 26 тысяч рабочых месцаў. Гэтая мера закранае ў тым ліку амаль 22 тысячы штатных супрацоўнікаў, якія маюць кантракты поўнай занятасці. Прадмет цяперашніх перамоў — спосаб скарачэння выдаткаў на персанал. Менеджменту трэба атрымаць згоду на гэты крок, бо рашэнне павінна быць разгледжана на сходзе акцыянераў, на якім будзе абмяркоўвацца план выратавання Lufthansa. У канцы мая страты кампаніі складалі мільён еўра ў гадзіну. Тады ж стала вядома, што ўлады ФРГ акажуць авіяперавозчыку падтрымку ў памеры дзевяці мільярдаў еўра, але на ўмовах частковай нацыяналізацыі. Стабфонд Германіі ў абмен на грошы атрымае прыблізна 20 працэнтаў акцый Lufthansa.

## У Італіі знайшлі выкрадзеную работу Бэнксі

Выкрадзены летась з парыжскага тэатра «Батаклан» твор брытанскага ананімнага мастака Бэнксі знойдзены на ферме ў італьянскай вобласці Абруца. Самы вядомы сучасны майстар стрыт-арту адлюстраваў на дзвярах аварыйнага выхаду скрушлівую постаць у памяць пра ахвяр тэракта, здзейсненага ў «Батаклане» 13 лістапада 2015 года. У пракуратуры горада Аквіла паведамілі, што выйсці на след твора атрымалася дзякуючы расследаванню, праведзенаму італьянскімі і французскімі праваахоўнымі органамі. Гэтая работа Бэнксі, як і многія яго малюнкі ў розных кутках свету, з'явілася ў Парыжы нечакана ў ноч на 25 чэрвеня 2018 года. Як вядома, ахвярамі серыі тэрактаў у тэатры і іншых раёнах французскай сталіцы сталі 130 чалавек.




## «НЕ АРОЛ...» І НЕ КАПІТАН!

...У родны Віцебск мы (мама, я і малодшы брацік) вярнуліся з так званых бежанцаў адразу пасля вызвалення ад фашысцкай навалы. Гэта было летам 1944-га, а ўвосень я ўжо стала першакласніцай і нават не без гонару заўважыла, што рыжык Жэнька з парты наперадзе на ўроках часта круціцца — просіць у мяне то аловак, то сцірку. На перапынках таксама чапляецца, цягае за косы.

Не магу сказаць, што мне гэта было непрыемна.

Зусім іншая гісторыя з дажджавымі чарвякамі. У клас іх неяк прынёс адзін з нашых хлопчыкаў, і дзяўчынкі як не зайшліся ад страху... А вось Жэнька сказаў, што з дзедам хадзіў на рыбу і што клявала яна якраз на чарвякоў, якіх насаджвалі на кручок — рукамі.

Жэнька паказаў як. Хлопчыкі паспрабавалі і сталі раскідваць гэтых чарвякоў на дзяўчынак.

Я вельмі спужалася (уявіла, што мне могуць трапіць у твар), аднак віду не падала, а нават наадварот — гучна заявіла:

— Падумаеш, чарвякі! Было б тут чаго баяцца!

Сказала так, з форсам задрала галаву і пайшла ў калідор.

На маё шчасце, у ім тут жа зазвінеў званок: перапынак скончыўся, скончылася і вакханалія з чарвякамі, пасля якой я зрабіла для сябе выснову, што страх лепш нікому не паказваць, трымаць пры сабе...

Іншыя пачуцці, дарэчы, таксама?

З часам я, напрыклад, стала заўважаць, што мне ў радасць бачыцца з Жэнькам, побач з ім, плячо ў плячо, ісці ў школу, размаўляць пра адзнакі, аднакласнікаў, настаўнікаў, гульні, кніжкі... Размовам, як мне здавалася, не будзе канца, але ж...

Варта было нам падысці, наблізіцца да школы ці іншых дзяцей, як мой спадарожнік тут жа змаўкаў: рабіўся хмуры, сур'ёзны, чужы. Неяк пытаю:

— Ты што — вады ў рот набраў?

— Якой вады? — сур'ёзна здзівіўся Жэнька.

— Звычайнай. Як адна царыца... Яна так рабіла, каб не пасварыцца, а ты чаго?

Карацей, у мяне да гэтага хлопчыка ўзнікла шмат пытанняў. Я час ад часу, мусіць, назаляла яму, а ўрэшце на кавалачку паперы напісала: «Жэня, я цябе лублю», алоўкам тыкнула Жэньку ў спіну, каб забраў цыдулку, і тут жа пачула грознае:

— Дай сюды запіску!

Нада мной стаяла настаўніца:

— Гэта не запіска, — пачырванела я. — Гэта... гэта...

Я спехам, на дробныя кавалачкі, рвала лісток, каб яго ніхто не прачытаў. А тым больш — перад класам, уголас...

Мяне паставілі ў кут.

...Праз шмат гадоў, калі сама працавала настаўніцай, ніколі не забірала вучнёўскіх запісак. Дзеці нават пыталі: чаму?

Згадваць ды расказваць, як некалі пісала сама, вядома ж, не выпадала. Так што даводзілася выстаўляць іншыя прычыны. І найпершая з іх — нельга чытаць чужыя лісты і запіскі.

...Не варта, як паказала жыццё, і спяшацца пісаць — асабліва шчырае «...Лублю». Гэта я зразумела яшчэ па гісторыі з Жэнькам.

Як гэта адбылося? Раскажу.

Настаўніца, якой я тады не аддала сваё прызнанне, забрала і ўсяму класу паказала мой варты жалю буквар. Справа ў тым, што не толькі я з ім клалася спаць і ўставала... У горадзе не было ніякіх дзіцячых садкоў, і малодшы брацік, калі я сыходзіла ў школу, з плачам бег за мной.

Суседка Якімаўна лавіла яго, як магла суцяшала і несла дамоў, дзе я «забывала» свой буквар. З ім малому хоць трохі ды было весялей. У пяць гадоў ён ужо навучыўся чытаць, а як маляваў!..

За пакрэмзаныя старонкі мне тады пад гарачую руку «ўляцела» ад мамы, на мяне, ледзь не злачынцу і неахайніцу — коса пазіралі аднакласнікі. Але самае крыўднае — адвярнуўся Жэнька.

Я вельмі перажывала з-за гэтага, аж пакуль не натрапіла на «Двух капітанаў» Каверына. Гэтая кніга стала для мяне адкрыццём — і свету, і чалавечых адносін. Дачытаўшы яе, я помню, вырашыла, што ў маім жыцці ўсё будзе так, як у Касі (гераіні кнігі).

А Жэнька? Не, на капітана ён ніяк «не цягнуў», таму і гараваць аб ім зусім не варта было.

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле,*
*Глыбоцкі раён.*

## ШУКАЙ ВЕТРУ Ў ПОЛІ. А ЗАЙЦА...

На чарговым прыпынку ў аўтобус зайшоў кантралёр (асобныя пасажыры тут жа выйшлі), папрасіў прад'явіць білеты.

— У мяне праязны, — заявіў сталага веку мужчына і выцягнуў з кішэні білет.

— Але ж ён за мінулы месяц, — кінуўшы вокам на «прад'яву», прызнаў правяральшчык. — А сёння пачаўся новы. Так што плаціце штраф.

— За што? — не разумеў «заяц». — Калі ўчора было трыццатае, то сёння ж — трыццаць першае?

— У мінулым месяцы (нават дзеці ведаюць) толькі трыццаць дзён, — растлумачыў кантралёр.

— А чаму гэта, калі ў большасці — трыццаць адзін?.. Вы з гэтымі трыццаццю толькі блытаніну ўносіце.

— Гэта не я, брат, а каляндар, — уздыхнуў кантралёр. — І не мой, а грыгарыянскі, складзены яшчэ ў 1582 годзе.

— Гэта чатырыста з гакам гадоў таму?! — уразіўся «заяц». — І што — з тых часоў яго не мянялі?! Якое ўпушчэнне! Які недагляд! Столькі адукаваных людзей навокал... Ну хоць бы і вы (пасажыр звярнуўся да кантралёра): па ўсім відаць — чалавек адукаваны. Дык чаму б вам не ўзяць і не стварыць новы талковы каляндар?! Яго б вашым прозвішчам назвалі... Уяўляеце?! Ды і заплацілі б...

— А колькі? — зацікавіўся кантралёр.

— Ну, канкрэтную лічбу я не назаву, — завагаўся пасажыр. — Да таго ж і плаціць будуць рознай валютай: кожная дзяржава, якая збярэцца ўводзіць ваш каляндар, — сваёй.

— Дык што — варта паспрабаваць? — пачухаў патыліцу кантралёр.

— Ну вядома ж. А для пачатку хоць заяўку падаць у бюро вынаходніцтваў, — падказаў пасажыр і, заўважыўшы, што ў аўтобус заходзяць новыя кантралёры, кінуўся да дзвярэй.

— Куды вы? Пастойце! — занепакоіўся кантралёр «стары». — Скажыце, як афармляць заяўку...

— Заўтра.

— А дзе вас шукаць?

— У аўтобусе.

«Заяц» выскачыў з салона. Аўтобус паехаў далей і разам з пасажырамі павёз надзею на тое, што не той «кантралёр» дык гэты, але прыдумае новы больш дасканалы каляндар і зажывём мы па ім неяк па-новаму.

**Вольга Фядзяшына,**
*г. Слуцк.*

## «ЖЫВІЦЕ, ПАКУЛЬ ЖЫВЕЦЦА...»

Некалі, да развалу Саюза, на слыху была фраза «мара паэта». І пра што ён, бедны, тады не марыў!..

Ці не найперш — пра моднае прыгожае адзенне, якога было не дастаць (тобок не купіць... І не толькі паэтам) яшчэ і з-за цэн.

Дык вось да мяне ў той час разоў колькі ды прылятала птушка шчасця «колеру ўльтрамарын». Неяк, напрыклад, цешча берэт падарыла — чорны, з бурачковай падкладкай, на якой па-чужынску, але золатам былі вышыты нейкія словы.

Люба-дарага паглядзець было на гэту афігенную прыгажосць, а калі і надзець... Ды з новым плашчом (балгарскім, светлабэжавым, з пагончыкамі)... Ален Дэлон — адпачывае! Дзяўчаты — вачэй не зводзяць, а каляжанка адна дык нават сказала, што я выліты... (Іспанскі мастак. Прозвішча не запомніў, бо ў тую хвіліну дужа шкадаваў, што гэты хіповы берэт мне падарыла цешча.)

Што было потым? Той падарунак неяк хутка знасіўся, плашч перастаў быць модным, і я вырашыў насіць яго потым, калі пайду на пенсію...

Дарэмна так думаў — глабалізацыя, Кітай, курткі... Ад таго Дэлона — адны ўспаміны і плашч, што вісіць сабе ў шафе (добры... Шкада выкідаць.)

...А ўзяць рацінавае паліто. Яно ж адназначна было тады марай, сведчаннем таго, што ты ўжо не голь перакатная, а чалавек: як мінімум — на грошы ўзбіўся ці ў людзі выбіўся (у «раціне» ўсё начальства хадзіла). Шыкоўная тканіна была: навобмацак — цёплая, ласкавая, у касы рубчык, а ўжо кішэні ў тым паліто...

Адкуль я ведаю? Ды неяк пашчасціла: у сталічным ЦУМе зарплату «абмяняў» на гэтую рэч. Прыбраўся, помню, і пайшоў на работу, а па дарозе адтуль — у кнігарню на Паркавай (потым — праспект Машэрава, цяпер Пераможцаў).

| 2 | **Станок универсальный консольно-фрезерный FWD32J с инв. № 2008, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9** | **2 500,00** | **250,00** |
| 3 | **Станок токарно-винторезный 16К20ПФ1 с инв. № 1313, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9** | **4 000,00** | **400,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок и место подачи заявления** | **По 22 июня 2020 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **23 июня 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС- Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 12.06.2020 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ООО «АМЛ-Авто»** (УНП 190935680) в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат», тел. +375 (29) 683-10-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **13 июля 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –
**машино-место, инв. № 500/D-708128622,**
**площадь 16,0 кв. м,**
**по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 30-135.**

Начальная цена предмета торгов – 11 080,02 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра: +375 (29) 683-10-88.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 13.06.2020 г. с 09.00 по 10.07.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.

## Песню бярыце з сабою...

# БЭЗУ КІПЕНЬ

Рубрыку вядзе кампазітар Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



**Змітрок МАРОЗАЎ (нар. у 1954-м) — выдатны беларускі паэт, празаік, публіцыст. Друкуецца з 1977 года. Аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі, у тым ліку «Акварэлі пачуцця», «Я ўсё часцей жадаю слухаць неба», «Вачыма сэрца» і іншых. Песня «Бэзу кіпень» нарадзілася з вершаў зборніка Змітрака Марозава «Я з вёскі, я — свойскі, язбоўскі». Гэтая шчырая паэзія кранае душу. Яна пра любоў да роднай зямлі, бацькоўскага дому, пра харство прыроды...**

**Вершы — Змітрок МАРОЗАЎ, музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

**1.** *Мне ўсё часцей бярозы сняцца,*
*Вярба пад матчыным акном,*
*Палі, дзе хмары табуняцца,*
*Што зацяжарылі дажджом.*

***Прыпеў:***
*Бэзу кіпень пад акном,*
*Пах язміну хмельны...*
*Заручуся вечарком*
*З яблынькай вясельнай.*
*Буду слухаць, як у сне,*
*Квецені дыханне,*
*Мо яна навее мне*
*Песню пра каханне.*

**2.** *Відаць, таму і настальгія*
*Маю душу туды заве,*
*Дзе жарабяткі маладыя*
*Пасуцца ў ранішняй траве.*

***Прыпеў.***

**3.** *Дзе салавей асірацелы*
*Шукае сэрцу спарыша,*
*Дзе ў туманах тварожна-белых*
*Мая згубілася душа.*

***Прыпеў.***




## Будзь у курсе!

### Лекі тэрмінова! Пажадана сёння...

### У Віцебску ўвялі экспрэс-рэжым дастаўкі лекаў

**Удвая хутчэй развозіць па дамах аптэчныя лекі пачалі ў Віцебску. Экспрэс-рэжым дастаўкі медыцынскіх вырабаў і прэпаратаў увялі сеткі аптэк ADEL і «Добрыя лекі».**

Раней лекі дастаўлялі ў рэжыме «сёння на заўтра». Аднак як толькі попыт на іх у абласным цэнтры на 67 працэнтаў перавысіў прагнозы, узнікла патрэба ў экспрэс-дастаўцы. На ёй настойвалі і пастаянныя пакупнікі, якія рабілі заказы паўторна.

«Больш за 70 працэнтаў зваротаў складаюць заказы на лекавыя сродкі — перш за ўсё гэта прэпараты кардыялагічнай групы, гарачкапаніжальныя, супрацьалергічныя прэпараты і венатонікі. Многія з іх ужываюцца штодня, а таму дастаўка дзень у дзень мае вырашальнае значэнне для пакупніка. У сувязі з ростам колькасці анлайн-заказаў і зваротаў саміх пакупнікоў з просьбай дастаўляць ім лекі ў дзень заказу мы вырашылі пайсці насустрач жыхарам Віцебска і перайсці на рэжым дастаўкі «сёння на сёння». Віцебск стаў першым горадам у Беларусі, жыхары якога пачалі атрымліваць лекі на дом у той жа дзень», — растлумачылі ў холдынгу «Аптэка Груп».

Новы рэжым дастаўкі не паўплываў на кошт, які застаўся ранейшым. Кур'еры развозяць заказы ад 30 рублёў, і тры рублі складае кампенсацыя работы кур'ерскай службы.

Дастаўка лекаў увайшла ў прэзідэнцкі пакет мер па падтрымцы эканомікі і сацыяльнай сферы. Пакуль гандляваць прэпаратамі па-за аптэкамі дазволена да 1 ліпеня. Такое права атрымалі 29 арганізацый, якія ўключаны ў спіс урада.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Даты | Падзеі | Людзі

### 12 ЧЭРВЕНЯ

**У краіне**

**1875** год — нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Адамаў, расійскі і беларускі батанік. Адзін з першых даследчыкаў расліннасці Беларусі. Аўтар навуковых прац па сістэматыцы раслін, дэндралогіі, геабатаніцы.



**1895** год — нарадзіўся Леапольд Іванавіч Родзевіч, беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, пісьменнік. У 1933-м і 1938-м рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1956-м.

**1930** год — нарадзіўся Антон Антонавіч Янкоўскі, беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па атамным спектральным аналізе з выкарыстаннем лазераў.

**1935** год — нарадзіўся Станіслаў Антонавіч Мячкоўскі, беларускі вучоны ў галіне аналітычнай і фізічнай хіміі, доктар хімічных навук, прафесар.

**1950** год — нарадзіўся Уладзімір Анатолевіч Вішнякоў, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі і інфармацыйных тэхналогій, доктар тэхнічных навук, прафесар.

У гэты ж дзень нарадзіўся Францішак Іванавіч Вісмант, вучоны ў галіне фізіялогіі і паталогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар.

**У свеце**

**1550** год — заснавана цяперашняя сталіца Фінляндыі — горад Хельсінкі.

У гэты ж дзень шведскі кароль Густаў I Ваза сваім указам перасяліў некалькі сотняў жыхароў горада Борг (Парвоа) у вусце ракі Ванда (Вантаа) з мэтай стварыць гандлёвы порт, які здольны канкурыраваць з ганзейскім горадам Рэвелем (цяпер Талін).

**1860** год — указам імператара Аляксандра II быў заснаваны Дзяржаўны банк Расійскай імперыі (з 1991-га — Цэнтральны банк Расійскай Федэрацыі (Банк Расіі).

**1905** год — заснавана Міжнародная федэрацыя цяжкай атлетыкі.

**1920** год — адбылося афіцыйнае адкрыццё Панамскага канала, які злучае Ціхі і Атлантычны акіяны. Агульная працягласць — 81,7 кіламетра.

У гэты ж дзень нарадзіўся Лазар Віктаравіч Карэлін, расійскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Мікраараён», «Землятрус», «Змеялоў», аповесцяў «Свой», «Адмоўнік», апавядання «Сон».

**1950** год — нарадзіўся Вячаслаў Іванавіч Палунін, клоўн-акцёр-мім, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Заснавальнік клоўн-мім-тэатра «Лiцэдзеі». Лаўрэат расійскай прэміі «Трыумф», прэміі Лоўрэнса Аліўе (Вялікабрытанія) і іншых.

**1965** год — у Англіі аб'яўлена аб узнагароджанні членаў гурта The Beatles ордэнамі Брытанскай імперыі «за выдатныя заслугі ў галіне культуры» і «ўнёсак у экспарт нацыянальнай прадукцыі». Уручэнне ўзнагарод адбылося ў кастрычніку таго ж года.

**Так гаварыла...**

**ГАННА АХМАТАВА:**
*«Жыць — дык на волі, паміраць — дык дома».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.42 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.40 | 17.21 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.32 | 17.05 |
| Гомель — | 4.34 | 21.19 | 16.45 |
| Гродна — | 4.54 | 21.55 | 17.01 |
| Брэст — | 5.05 | 21.47 | 16.42 |

## Месяц

*Поўня 5 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

**Пр.** *Ісака.*
**К.** *Антаніны, Леакадзіі, Яніны, Андрэя, Ануфрыя, Лявона, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Так, у свой час жыццё мяне шмат паматала... Пайшоў з дому ў 18 — голы, босы, ні крошкі ў роце, са сваім юнацкім максімалізмам! Прыйшоў назад у 18.30.**

— Слухайце, Пётр Васілевіч, чаму вы ўчора так крычалі на сваю жонку?

— Яна не хацела казаць, куды спусціла грошы.

— Ну добра, а чаму сёння вы так крычалі?

— Сёння яна мне сказала.

**— Як ты лічыш, што такое шчасце?**

**— Шчасце — гэта мець прыгожую жонку.**

**— А што тады няшчасце?**

**— Няшчасце — гэта мець такое шчасце.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1844.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

12 чэрвеня 2020 г. № 22 (558)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# КУПЛЯЙ І НЕ ГУБЛЯЙ!



## Як правільна рабіць пакупкі ў інтэрнэт-крамах, каб не застацца з носам?

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**СЁННЯ рынак інтэрнэт-гандлю развіваецца гіганцкімі крокамі. Дадайце да гэтага сітуацыю з пандэміяй, калі жаданне купляць ёсць, а пайсці дзеля гэтага ў нейкую краму страшнавата: ці мала чаго падхопіш па дарозе? Вось і атрымліваецца, што купля анлайн стала нашым сённяшнім спадарожнікам жыцця: гэта бяспечна з пункту гледжання сацыяльнага дыстанцыявання, дастаткова хутка, а для лянівых яшчэ і камфортна (усё ж такі не трэба нікуды ісці, каб набыць нейкую рэч). Але... Ці настолькі гэта бяспечна з іншага пункту гледжання — фінансавага? Ці не сутыкаліся вы з тым, што ў інтэрнэце прапануюць адно, а па факце атрымліваецца зусім іншае — кур'ер прывозіць не тое, што чакалі, або рэч не адпавядае заяўленым якасцям? Што з гэтым рабіць і як абараніць свае інтарэсы, «МС» распытала ў начальніка ўпраўлення аховы правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іны ГАЎРЫЛЬЧЫК.**

стар. 4, 13

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# Міхаіл РУСЫ: «НАСПЕЎ ЧАС КОМПЛЕКСНАЙ ДАПРАЦОЎКІ КОДЭКСА АБ ЗЯМЛІ»

**Пра «падводныя камяні» спрэчных пытанняў па зямлі, асаблівасці іх узнікнення і шляхі вырашэння канфліктных сітуацый гутарым са старшынёй Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаілам РУСЫМ.**

***— Міхаіл Іванавіч, апошнім часам зямельнае пытанне вельмі часта гучыць падчас асабістых прыёмаў грамадзян і правядзенні прамых тэлефонных ліній членамі Савета Рэспублікі. Нярэдка праблемы ўзнікаюць з-за таго, што ў раёне калісьці няправільна зарэгістравалі ці ўвогуле не зарэгістравалі зямельны ўчастак, а сёння з-за такой «дробязі» пакутуюць канкрэтныя людзі. Такім чынам зямельнае пытанне становіцца ў пэўным сэнсе народным. На якія думкі яно наводзіць вас?***

— Тут няма нічога дзіўнага. Зямельнае пытанне ў Беларусі заўсёды было, як вы кажаце, народным. Бо закранала і закранае ў той ці іншай ступені інтарэсы многіх нашых суайчыннікаў.

Сапраўды, аналіз шматлікіх зваротаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання ў Савет Рэспублікі, выезды сенатараў на месцы сведчаць пра тое, што ў грамадстве даўно наспела пытанне сутнаснага ўдасканалення заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель. У сенатараў ёсць разуменне неабходнасці сістэмнай рэвізіі і канцэптуальнага перагляду гэтых праваадносін, у тым ліку змены неактуальных нарматыўных прадпісанняў і тых, што не выкарыстоўваюцца на практыцы.

Таму праект закона «Аб змяненні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі» будзе істотна перапрацаваны ў мэтах вырашэння шэрагу часам вострых пытанняў з улікам правапрымяняльнай практыкі і запытаў грамадзян. Зваротная сувязь з народам вельмі важная для парламентарыяў, бо яна дазваляе ўбачыць вузкія месцы ў зямельным заканадаўстве, адчуць новыя праблемы і пытанні, якія ставіць жыццё.

***— Якое месца гэта работа займае ў дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні?***

— Самае непасрэднае і значнае. Члены нашай камісіі выступаюць за комплексную дапрацоўку Кодэкса аб зямлі. Напрыклад, намі разгледжана пытанне правядзення прававога маніторынгу закона ад 17 ліпеня 2018 года «Аб нарматыўных прававых актах». У камісіі прыйшлі да высновы, што сённяшняя правапрымяняльная практыка сведчыць аб неабходнасці карэкціроўкі палажэнняў згаданага закона, у частцы выкарыстання пакетнага прынцыпу распрацоўкі законапраектаў.

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Брэнд і гонар



Мадэрнізацыя вытворчасці, асваенне выпуску новых узораў тэхнікі і рэалізацыя інвестпраектаў на БелАЗе. стар. 2

### Што новага?



Навацыі ў рабоце натарыята краіны і змены ў валютным рэгуляванні і валютным кантролі. стар. 2

### Анлайн-шопінг



Карэспандэнт «МС» выпрабавала на сабе віртуальныя пакупкі. Што з гэтага атрымалася? стар. 4,13

### Крыніцы жыцця



У Гомельскім раёне адкрыліся новыя станцыі абезжалезвання. стар. 16

### Грошы пад ідэі



Сацыяльна значныя ініцыятывы прафінансуюць у 12 раёнах краіны. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# На карысць адукацыі

## Агульная платформа для навучання, інфармацыйная бяспека школьнікаў і імідж педагогаў

У панядзелак, 8 чэрвеня, у Савеце Рэспублікі прайшло пасяджэнне Асацыяцыі кіраўнікоў устаноў адукацыі. Разам са старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай дырэктары школ у рэжыме анлайн абмеркавалі стварэнне адзінай платформы дыстанцыйнага навучання, пашырэнне ўзаемадзеяння з сям'ёй і іншыя актуальныя пытанні сістэмы адукацыі.

У відэаканферэнцыі таксама ўдзельнічалі супрацоўнікі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, каардынатары дзейнасці Беларускага педагагічнага таварыства, члены Асацыяцыі кіраўнікоў устаноў адукацыі.

Наталля Качанава нагадала, што асноўныя кірункі ў развіцці адукацыі дакладна вызначыў Рэспубліканскі педагагічны савет, у якім у 2017 годзе браў удзел Прэзідэнт.

— Для нас важна сёння, як выконваюцца даручэнні, якая сітуацыя складваецца ў навучальных установах краіны, як прайшла чацвёртая вучэбная чвэрць, якая супала з няпростым эпідэміялагічным перыядам. Пытанні, што вынесены на абмеркаванне, вельмі актуальныя, — звярнула ўвагу старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты парламента выказала ўпэўненасць, што размова будзе карысная і паспрыяе таму, «каб і надалей прымаць, калі гэта спатрэбіцца, абсалютна правільныя і выверaныя рашэнні, якія будуць на карысць развіцця сістэмы адукацыі».

Падчас відэаканферэнцыі абмяркоўвалася выкарыстанне ў навучальным працэсе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Гаворка ішла перш за ўсё пра адзіную платформу дыстанцыйнага навучання, распрацоўка якой цяпер вядзецца.

— Ідзе актыўная работа. Збіраюцца матэрыялы вядучых педагогаў, настаўнікаў-метадыстаў. Школы прапануюць свой матэрыял для гэтай платформы. Гэта ўсё акумулюецца, — паведаміла журналістам **член Савета Рэспублікі, дырэктар сталічнай гімназіі № 10, старшыня савета Асацыяцыі кіраўнікоў устаноў адукацыі Марына ІЛЬІНА.** Паводле яе слоў, партал ствараецца з выкарыстаннем перадавых тэхналогій. Ён стане пляцоўкай, дзе дзеці змогуць атрымаць кампетэнтныя адказы на пытанні са школьнай праграмы.

— Мяркую, гэта будзе вельмі дастойная платформа, дзе можна будзе аддалена атрымліваць якасную адукацыю. Зробім усё магчымае, каб платформа пачала працаваць да канца года, — падкрэсліла сенатар.

Акрамя таго, падчас відэаканферэнцыі асацыяцыя закранула тэму інфармацыйнай бяспекі школьнікаў. Разглядалася таксама магчымасць прыняцця дзяржаўнай праграмы, накіраванай перш за ўсё на фарміраванне станоўчага іміджу настаўніка, яго прафесійнае развіццё, матэрыяльную падтрымку.

Педагогі таксама абмеркавалі сучасныя падыходы ў рабоце з сям'ёй. У прыватнасці, агучвалася прапанова аб стварэнні серыі тэлеперадач для бацькоў па розных пытаннях, звязаных з адукацыяй.

### НАША ДАВЕДКА

Асацыяцыя кіраўнікоў устаноў адукацыі створана ў структуры Беларускага педагагічнага таварыства ў 2013 годзе. Сярод яе мэт — удасканаленне дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, заканадаўчай базы ў сферы адукацыі, выяўленне і распаўсюджванне эфектыўнага вопыту ў сферы кіравання ўстановамі адукацыі.

**Паводле БелТА.**

# БРЭНД І ГОНАР КРАІНЫ

## Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА наведала адзін з флагманаў айчыннага машынабудавання — ААТ «БелАЗ»

**У цэнтры ўвагі падчас сустрэчы былі тэмы мадэрнізацыі вытворчасці, асваення выпуску новых узораў тэхнікі і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на прадпрыемстве.**



Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што яго прадукцыяй ганарыцца не толькі наша краіна — яе ведаюць ва ўсім свеце.

— Добрае, годнае прадпрыемства — адно з найлепшых. І мы шчыра кажам праўда тое, што ганарымся ім, бо БелАЗ — гэта адзін з брэндаў нашай краіны, — падкрэсліла яна. — Такія прадпрыемствы, як МТЗ, МАЗ, БелАЗ, — гэта апора ў прамысловасці.

Але так было не заўсёды. У пачатку 1990-х не хапала заказаў, ранейшыя сувязі былі парушаныя. З тых часоў шмат зроблена. Дастаткова толькі сказаць, што цяпер ААТ «БелАЗ» з'яўляецца найбуйнейшым у свеце вытворцам кар'ерных самазвалаў і транспартнага абсталявання для горназдабывальнай і будаўнічай прамысловасці, займае каля 30 % сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў вялікай грузападымальнасці. Тут адбываецца зборка самага буйнога ў свеце кар'ернага самазвала, які можа перавозіць грузы да 450 тон.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што за цяперашнімі дасягненнямі БелАЗа стаяць вялікія намаганні людзей, якія тут працуюць. Акрамя вытворчых паказчыкаў, сённяшнім набыткам завадчан з'яўляюцца і добрая сацыяльная сфера, і прывабны сацыяльны пакет — гэта дарагога каштуе, упэўнена спікер верхняй палаты парламента.

Падчас наведвання прадпрыемства Наталля Качанава пабывала ў цэхах. Спікера верхняй палаты парламента таксама праінфармавалі аб бягучых сацыяльна-эканамічных паказчыках работы ААТ «БелАЗ» і іншых прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у холдынг «БелАЗ-холдынг». Асноўнымі прынцыпамі вытворчай стратэгіі тут лічаць уменне канцэнтравацца на галоўным, спалучэнне інавацый, вядучых маркетынгавых тэхналогій і высокага прафесіяналізму калектыву.

На ключавых заводскіх пляцоўках старшыня Савета Рэспублікі пазнаёмілася з вытворчым патэнцыялам і навукова-тэхнічнымі магчымасцямі прадпрыемства, геаграфіяй экспартных паставак, а таксама з працэсам мадэрнізацыі і далейшымі планамі кіраўніцтва па аднаўленні завода. Так, прапрацоўваецца магчымасць рэалізацыі праекта па мадэрнізацыі вытворчасці на 2020—2025 гады, мэтай якой з'яўляецца пашырэнне магутнасцяў па вытворчасці кар'ерных самазвалаў, падземнай і будаўніча-дарожнай тэхнікі і спецтэхнікі.

Наталлі Качанавай прадэманстравалі тэхналагічны ланцужок укаранення ў прэсавым цэху найноўшага высокатэхналагічнага комплексу фарбавання дэталяў і вузлоў кар'ернай тэхнікі БелАЗ, аналагаў якому па ўзроўні рабатызацыі ў свеце няма.

Што датычыцца экспартнай дынамікі, то з пачатку бягучага года на прадпрыемстве дыверсіфікавалі экспартныя пастаўкі за кошт павелічэння ў агульным аб'ёме адгрузкі долі краін «дальняй дугі», а таксама асваення новых сегментаў рынку горнага абсталявання. За перыяд са студзеня да мая прадукцыя прадпрыемства накіроўвалася ў 20 краін, 13 з якіх належаць да далёкага замежжа. І на гэтым спыняцца не збіраюцца.

Дарэчы, міністр прамысловасці Пётр Пархомчык, які суправаджаў спікера верхняй палаты парламента і знаёміў з ключавымі аспектамі дзейнасці аднаго з флагманаў айчыннага машынабудавання, да нядаўняга часу ўзначальваў яго.

— Прыход у міністэрства кіраўніка такога ўзроўню надасць новы імпульс развіццю прамысловасці нашай краіны, — падкрэсліла на сустрэчы з калектывам Наталля Качанава. — Таму што Беларусь заўсёды славілася такімі прадпрыемствамі, як БелАЗ.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### У тэму

БелАЗ актыўна ўдзельнічае ў сумесных пілотных праектах па ўкараненні інавацыйных тэхналогій. Напрыклад, цяпер у Хакасіі адбываюцца выпрабаванні беспілотных «беларускіх волатаў» з дапамогай тэхналогій 5G. Падчас эксперымента, які працягнецца некалькі тыдняў, кіроўцы будуць вадзіць машыны дыстанцыйна.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ШТО НОВАГА Ў НАТАРЫЯЦЕ І АБАРАЧЭННІ ВАЛЮТЫ?

**Адбылося чарговае пасяджэнне сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання. Разгледжана васямнаццаць пытанняў, ратыфікаваны шэраг міжнародных пагадненняў і пратаколаў з замежнымі краінамі.**

Істотныя і станоўчыя перамены чакаюцца ў рабоце натарыята краіны дзякуючы зменам у законах па пытаннях натарыяльнай дзейнасці. Што гэта за навaўвядзенні? Як адзначыў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ,** уводзіцца прынцып экстэрытарыяльнасці сведчання здзелак з нерухомасцю. Раней трэба было звяртацца да натарыуса па месцы знаходжання аб'екта маёмасці, скажам, кватэры ці дачы. Цяпер дапаможа спецыяліст, незалежна ад таго, на тэрыторыі якога раёна знаходзіцца нерухомасць.

Таксама павялічваецца памер страхавой кампенсацыі ў выпадку памылкі натарыуса, якая стала прычынай маёмаснай страты кліента. Акрамя натарыуса адказнасць страхуе таксама і Беларуская натарыяльная палата — да 10 тысяч базавых велічынь. Хоць, па словах міністра, такія выпадкі адзінкавыя, усё ж сенатары палічылі, што інтарэсы кліента павінны быць на першым плане. Пашыраецца пералік страхавых выпадкаў, якія падлягаюць кампенсацыі.

Павялічваецца і тэрмін іскавай даўнасці па патрабаваннях аб выплаце кампенсацыі, па дагаворы страхавання грамадзянскай адказнасці натарыуса з трох да дзесяці гадоў. Бо нярэдка па здзелках з нерухомасцю пытанне аб кампенсацыі шкоды паўстае праз шмат гадоў.

Своечасовымі з'яўляюцца змяненні закона па пытаннях валютнага рэгулявання і валютнага кантролю. **Намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** назваў важнай навацыяй адмову ад жорсткіх тэрмінаў рэпатрыяцыі валютнай выручкі ў Беларусь. Цяпер гэтыя тэрміны будуць вызначаць самі прадпрыемствы. Такія радыкальныя змены дазволяць знізіць адміністрацыйную нагрузку на бізнес, павысіць эфектыўнасць работы і канкурэнтаздольнасць прадпрыемстваў на знешніх рынках, што асабліва важна ў сённяшніх умовах.

Цікавасць уяўляе заканадаўча замацаваны пералік выключных выпадкаў дазволеных разлікаў у замежнай валюце. «Гэта выпадкі, якія альбо маюць жалезнае эканамічнае абгрунтаванне, альбо непазбежныя. Ва ўсіх астатніх выпадках як сродак плацяжу павінен выкарыстоўвацца беларускі рубель. Гэта тое, што адбываецца ў рамках дэвалютызацыі і павышэння даверу да нацыянальнай валюты», — адзначыў Сяргей Калечыц.

Важныя перамены чакаюцца і ў правядзенні аперацый, звязаных з рухам капіталаў, размяшчэннем сродкаў за мяжой, купляй замежных каштоўных папер. Раней прадпрыемствам і фізічным асобам трэба было ісці па дазвол у Нацбанк. Дазвол патрабаваўся і для адкрыцця рахункаў за мяжой. Але пасля пераходу з 2015 года да новага рэжыму манетарнай палітыкі, на гібкае курсаўтварэнне, рост даверу да беларускага рубля неабходнасць у такім жорсткім рэгуляванні адпала. Цяпер новае заканадаўства дазваляе без абмежаванняў аперацыі капітальнага характару для фізічных асоб і адкрыццё рахункаў за мяжой для прадпрыемстваў. А замест дазвольнага парадку стане выкарыстоўвацца сістэма маніторынгу. Фізічным асобам, прадпрыемствам трэба будзе проста паведаміць у Нацбанк аб характары гэтых аперацый.

Паводле слоў Сяргея Калечыца, краіна фактычна атрымала новую рэдакцыю закона аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі. Гэта, па сутнасці, завяршальны этап мадэрнізацыі беларускага валютнага заканадаўства, які знамянуе пераход ад дазвольнай сістэмы да рэгістрацыйнай па цэлым шэрагу банкаўскіх інструментаў і аперацый.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# «НАСПЕЎ ЧАС КОМПЛЕКСНАЙ ДАПРАЦОЎКІ КОДЭКСА АБ ЗЯМЛІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)***

Мушу адзначыць, што прынцып сістэмнасці і комплекснасці прававога рэгулявання грамадскіх адносін забяспечваецца ў тым ліку падрыхтоўкай і прыняццем пакета нарматыўных прававых актаў, накіраваных на сістэмнае і комплекснае прававое рэгуляванне пэўнай сферы грамадскіх адносін. Тым самым забяспечваецца рэалізацыя новага нарматыўнага прававога акта, у тым ліку і тых, якія прадугледжваюць змяненне, прызнанне страціўшымі сілу ўзаемазвязаных нормаў, якія змяшчаюцца ў розных нарматыўных прававых актах.

Як паказвае практыка, менавіта на стадыі распрацоўкі падзаконных актаў нарматворчы орган выяўляе шматлікія «падводныя камяні» новага прававога рэгулявання, закладзенага ў законе. Гэтага можна пазбегнуць, калі вызначаць змест падзаконных актаў адначасова са зместам законапраекта. На нашу думку, належнае выкарыстанне пакетнага прынцыпу павінна стаць дзейсным спосабам недапушчэння несвоечасовай падрыхтоўкі і прыняцця нарматыўных прававых актаў, неабходных для рэалізацыі нормаў законаў, а таксама забеспячэння стабільнасці заканадаўства.

Гэта дазволіць выключыць выпадкі, калі дзяржаўнымі органамі, упаўнаважанымі на прыняцце адпаведных актаў заканадаўства, гэтыя дакументы прымаюцца з парушэннем устаноўленага тэрміну альбо зусім не прымаюцца. У сувязі з гэтым прапануем усталяваць у законе норму, якая прадугледжвае абавязковасць падрыхтоўкі пакета праектаў нарматыўных прававых актаў у выпадках увядзення прынцыпова новых падыходаў прававога рэгулявання ў пэўнай сферы грамадскіх адносін ці змены канцэптуальных палажэнняў заканадаўства.

***— Будзем спадзявацца, што гэтыя меры дазволяць знізіць градус канфліктаў па зямельных і іншых жыццёвых пытаннях. Дарэчы, чым часцей за ўсё незадаволеныя аўтары зваротаў у верхнюю палату парламента?***

— Людзі, з аднаго боку, нярэдка скардзяцца на прэтэнзіі і патрабаванні мясцовых улад аб зносе незаконна пабудаваных дамоў і аб'ектаў. Другая значная частка зваротаў утрымлівае скаргі на адмову ў рэгістрацыі незаконна пабудаваных дамоў. Узнікаюць часта міжсуседскія канфлікты.

Вось у нечым тыповы прыклад з жыцця. Побач знаходзяцца два зямельныя ўчасткі. На адным — станцыя тэхнічнага абслугоўвання, на другім — аўтамыйка. Гаспадару, які развівае сэрвіс аўтатранспарту, не хапае зямлі. Ён дамаўляецца з суседам аб згодзе на перадачу яму дзвюх сотак, той пагаджаецца. Усё афіцыйна замацоўваецца. Раптам сусед прадае свой участак з аўтамыйкай. Новы гаспадар лічыць сваімі перададзеныя папярэднім уладальнікам дзве соткі. Узнікае канфлікт. І падобных пытанняў шмат. Змены ў Кодэксе аб зямлі дазволяць пазбягаць падобных непаразуменняў.

Яшчэ прыклад. Чалавеку, згодна з яго пісьмовай просьбай, выдзяляецца маляўнічы ўчастак 25 сотак для вядзення дапаможнай гаспадаркі, але там чамусьці ўзводзіцца загарадны дом ці дача з лазняй. Падчас спробы рэгістрацыі гэтай нерухомасці да гаспадара з боку мясцовых улад узнікае законная прэтэнзія: а дзе ж аб'екты дапаможнай гаспадаркі? Няма? Дык і рэгістрацыі не будзе. Так, хітрун сам вінаваты ў нямэтавым выкарыстанні зямлі. Гэта бясспрэчна. Але ўзнікае пытанне і да работнікаў раённых службаў, сельсавета: няўжо яны не бачылі, што там незаконна будуецца жыллё? Сумнеўна.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Ці шмат фактаў падобнай чыноўніцкай блізарукасці?***

— Дастаткова. Дарэчы, пры вывучэнні ў Савеце Рэспублікі зваротаў грамадзян становяцца відавочныя істотныя недахопы ў рабоце некаторых органаў мясцовай улады, выканкамаў пасялковых і сельскіх Саветаў па падрыхтоўцы першасных дакументаў па зямельных пытаннях. Часам праяўляецца юрыдычная непісьменнасць, вольнае трактаванне заканадаўчых актаў, безадказнасць, бюракратызм. А ў выніку ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі, якія можна было б загадзя папярэдзіць.

Цікавы выпадак здарыўся ў Мінскай вобласці. Жыхару Маладзечна афіцыйна выдзелілі ўчастак зямлі пад будаўніцтва жылля. Той рабіў усё па законе, аманы ужо пабудаваўся, калі раптоўна высветлілася, што дом узводзіцца ў ахоўнай зоне газаправода. Гарадскія ўлады запатрабавалі знесці пабудову. Але чалавек у чым вінаваты? У тым, што не пераправерыў рашэнне чыноўніка на прадмет правільнасці яго дзеянняў? Суд як ні дзіўна палічыў правамерным патрабаванне мясцовай улады аб зносе дома. А на маю думку, знос павінен быць за кошт таго чыноўніка, які падставіў чалавека. Так будзе справядліва.

***— А ці заўсёды самі забудоўшчыкі без граху ў зямельных пытаннях?***

— Я б не сказаў. Здараецца, яны наўмысна ідуць на парушэнні. Скажам, парушаюць праектнае размяшчэнне дома на ўчастку з дробным захопам зямлі. З аднаго боку прыхапілі кавалак, з другога вылезлі за межы вызначаных параметраў участка на метр-два. І такім чынам незаконна прыдбалі пару сотак. Сёння гэтыя парушэнні проста фіксуюцца. А потым незадаволеныя пішуць і скардзяцца ў вышэйстаячыя інстанцыі на нелаяльнасць раённых службаў, маўляў, праяўляюць чэрствасць, неразуменне, патрабуюць справядлівага, на іх погляд, разгляду пытання.

Бываюць выпадкі, калі мясцовыя ўлады забіраюць у грамадзян участак з домам з прычыны ўзвядзення на гэтай тэрыторыі неабходнага гораду вялікага аб'екта. Людзі скардзяцца на недастатковую кампенсацыю іх страт. Такія выпадкі характэрныя больш для Мінска, абласных цэнтраў. Пытанне няпростае, але яно павінна вырашацца з улікам інтарэсаў абодвух бакоў.

***— А шмат зваротаў паступае на ваш разгляд?***

— Сёлета за перыяд са студзеня да мая наша камісія атрымала каля 400 зваротаў.

***— Я так разумею, што ў камісіі работа са зваротамі грамадзян знаходзіцца пад асаблівым кантролем?***

—Так. Трэба адзначыць, што старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава пастаянна арыентуе сенатараў вельмі ўважліва ставіцца да разгляду зваротаў грамадзян. Ды і сама Наталля Іванаўна заўсёды прытрымліваецца гэтага прынцыпу ў рабоце. Асабліва, калі ў сталічных кабінетах цяжка зразумець усе прычыны, аспекты і наступствы жыццёвых цяжкасцяў, якія турбуюць людзей. Таму актыўна практыкуецца разгляд зваротаў з выездам на месца. Так лепш унікнуць у тое, што непакоіць чалавека. І гэта датычыцца не толькі зямельных пытанняў.

Я, напрыклад, адносна нядаўна па даручэнні Наталлі Іванаўны разбіраўся ў сітуацыі, якая склалася ў вёсцы Ячкавічы Іванаўскага раёна. Там па-чыноўніцку падышлі да працэсу прыватызацыі жылых дамоў. Ацэнка іх кошту, згодна з бухгалтарскім улікам прадпрыемства, не адпавядала ні цяперашняму стану дамоў, ні цэнам, якія складаліся ў рэгіёне на жыллё.

Многія асаблівасці і дэталі прыватызацыі не былі адлюстраваны ў звароце вяскоўцаў. Толькі пасля таго як спецыялісты на свае вочы ўбачылі тыя дамы, пагутарылі з людзьмі, вывучылі дакументы, удалося скласці аб'ектыўнае ўражанне. І, аказваецца, як ні дзіўна, усё ў Іванаве было зроблена па законе.

***— І якія сёння робяцца захады па гэтым і іншых зваротах?***

— Я моцна спадзяюся на тое, што сумесна са спецыялістамі з Дзяржаўнага камітэта па маёмасці нам удасца вырашыць не толькі гэта прыватнае пытанне, але і ўнесці адпаведныя змены ў заканадаўства. Каб у будучым у краіне такія спрэчныя пытанні калі і ўзнікалі, то вырашаліся працей і адпавядалі рэальнаму стану спраў.

Іншы канкрэтны прыклад. Да нас звярнуліся жыхары дамоў № 6 і № 4 па вуліцы Глебаўка ў аграгарадку Калодзішчы Мінскага раёна з просьбай пасадзейнічаць у паскарэнні ліквідацыі падтаплення. Іх зварот быў разгледжаны сумесна з раённым выканаўчым камітэтам і неўзабаве прадпрыемства «Мінскгаррамаўтадар» выканала ўсе неабходныя работы па Глебаўцы: былі ўсталяваны бартавыя камяні, арганізаваны пад'езд да ўчасткаў.

***— І яшчэ адно актуальнае пытанне. Дарогі таксама ў прыярытэце пытанняў грамадзян з месцаў. Многіх цікавіць лёс дарожнага збору. Ваша меркаванне на гэты конт?***

— Ужо агучаны шэраг прапаноў па ўдасканаленні аплаты дарожнага збору, але канчатковае рашэнне пакуль не прынята. Да абмеркавання гэтага пытання далучыліся і члены Савета Рэспублікі.

На мой погляд і на думку іншых калег-сенатараў, варта прывязаць дарожны збор да кошту паліва: больш рухаешся па краіне — больш і плаці. Так будуць выкананы і прынцып сацыяльнай справядлівасці і забяспечана максімальна магчымая поўната збору за карыстанне дарогамі.

***— Вечная тэма — сфера жыллёва-камунальных паслуг. Якія тут захады мяркуюць зрабіць сенатары для паляпшэння яе дзейнасці?***

— Нягледзячы на прымаемыя меры па-ранейшаму ад грамадзян паступае значная колькасць зваротаў, якія датычацца такіх праблем, як тэхнічны і санітарны стан жылых дамоў, праведзенне капітальнага і бягучага рамонтаў, якасць работы камунальных службаў і паслуг, якія імі аказваюцца. Такая сітуацыя патрабуе аператыўнага прыняцця комплексу мер па іх вырашэнні як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях. Відавочна, што наспела неабходнасць карэкціроўкі выпрацаванай урадам канцэпцыі развіцця ЖКГ і адпаведнай заканадаўчай базы. Савет Рэспублікі гатовы далучыцца да гэтай работы.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

---

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## «Добра, будзем разбірацца...»

**Спектр пытанняў, з якімі звярнуліся на прамую лінію да віцэ-спікера Савета Рэспублікі Анатоля ІСАЧАНКІ жыхары розных куткоў нашай краіны, быў разнастайны: ад садзейнічання ў працаўладкаванні да вырашэння маёмасных праблем.**



Геаграфія званкоў, як звычайна, была шырокая: ад невялічкіх вёсачак да сталіцы. Усіх заяўнікаў намеснік старшыні Савета Рэспублікі ўважліва выслухаў, пры неабходнасці задаваў удакладняючыя пытанні.

У прыватнасці, пажылая мінчанка паведаміла віцэ-спікеру пра сітуацыю ў садовым таварыстве, што месціцца ў Мінскім раёне: побач Мінскае мора, зона курортная, зямля дарагая... Старшыня гэтага таварыства, на думку заяўніцы, скарысталася магчымасцю і як юрыдычная асоба атрымала ў карыстанне лапік зямлі са старажытнымі дубамі, што як фізічная асоба зрабіць не змагла б ніяк. Безумоўна, зямельныя пытанні — адны з самых складаных у практыцы іх разгляду, таму высвятляць усе акалічнасці адказным асобам давядзецца карпатліва. Анатоль Ісачанка запэўніў жанчыну, што яе пытанне будзе вывучана ўважліва.

Жыхарка горада Барысава паскардзілася, што не можа прадаць сваю частку дома, бо астатнія ўладальнікі пабудавалі калісьці на агульным участку гаспадарчыя пабудовы і яны да гэтага часу неўзаконеныя. Таму цяпер яна не можа атрымаць афіцыйнага дазволу ад гарадскіх улад на продаж сваёй маёмасці — маўляў, ідзіце ў суд. Стан здароўя жанчыны не дазваляе ёй судзіцца з суседзямі. Вось і просіць дапамогі ў намесніка старшыні Савета Рэспублікі. Пытанне няпростае, пагадзіўся ён і паабяцаў разабрацца дэтальна, чым можна дапамагчы ў такім становішчы.

Жыхарка Смаргоні, што на Гродзеншчыне, прасіла ад імя суседзяў аб садзейнічанні з пракладкай водаправода па вуліцы Кірава. Жанчына сцвярджае, што шматлікія звароты да мясцовых улад не прынеслі жаданага выніку. Здавалася б, праектна-каштарысная дакументацыя ёсць, але кошт, які павінны аплаціць людзі за сваёй кішэні, іх не задавальняе. Так, агучаная жанчынай сума немалая, пагадзіўся Анатоль Ісачанка, трэба высвятляць, з чаго яна складаецца.

— Добра, будзем разбірацца, — паабяцаў ён і даручыў звязацца з мясцовымі ўладамі, каб атрымаць адказы на пытанні па разліку.

Пажылая заяўніца з Беразіно, што на Міншчыне, прасіла пасадзейнічаць у працаўладкаванні: яна на пенсіі, але хацела б крыху падрабіць, каб мець магчымасць закончыць рэканструкцыю дома. Мужчына з Касцюковіч Гомельскай вобласці папрасіў дапамагчы з медабслугоўваннем.

Усім, хто звярнуўся са сваімі пытаннямі ў Савет Рэспублікі, безумоўна, падрыхтуюць грунтоўныя адказы — ніводны зварот не застанецца без належнай увагі.

— Частка пытанняў, з якімі сёння звярнуліся грамадзяне, магла б быць вырашана на мясцовым узроўні, — адзначыў у размове з журналістамі Анатоль Ісачанка. — Калі людзі звяртаюцца, мы павінны іх выслухаць і прыняць усе меры, каб аказаць садзейнічанне і дапамагчы.

Ён адзначыў, што здараюцца сітуацыі, якія на мясцовым узроўні нельга вырашыць, таму людзі выходзяць на рэспубліканскі, дзе ў вырашэнні іх пытання можна атрымаць падтрымку.

Адпаведныя даручэнні былі дадзены і па выніках правядзення цяперашняй прамой лініі. Усе пытанні будуць знаходзіцца на кантролі да іх вырашэння.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# КУПЛЯЙ

## Змяняць цану нельга

Напачатку мадэлюем сітуацыю, з якой не так даўно сутыкнуўся наш чытач (хіба што ў такую гісторыю мог трапіць хто заўгодна): ён хацеў набыць электраінструмент, які ўбачыў на сайце адной з інтэрнэт-крамаў па прымальным кошце, заказаў яго, атрымаў пацвярджэнне заказу, але пазней даслалі паведамленне, маўляў, цана павысілася, прабачце, купляйце па новым цэтліку. Так можна?

— Згодна з артыкулам 464 Грамадзянскага кодэкса (ГК) прапанова тавара ў яго рэкламе, каталогах і апісаннях тавараў, якія аднесены да нявызначанага кола асоб, прызнаецца публічнай афертай, калі яна ўтрымлівае ўсе істотныя ўмовы дамовы куплі-продажу. Асоба, якая размясціла публічную аферту, абавязана заключыць дамову на тых умовах, што былі ўказаны, з любым, хто адзавецца, — тлумачыць спецыяліст.

Паводле яе слоў, продаж тавараў у інтэрнэце лічыцца продажам па ўзорах і павінен выконвацца толькі праз інтэрнэт-крамы, зарэгістраваныя ў Гандлёвым рэестры нашай краіны. Згодна з існуючымі правіламі гандлю, прапанова тавару па ўзоры прызнаецца публічнай афертай.

Далей: ці можна разглядаць пацвярджэнне заказу як згоду для далейшага заключэння дамовы на заяўленых умовах? Так, сцвярджае суразмоўніца, дамова лічыцца заключанай, калі гандляр атрымаў ад пакупніка згоду на набыццё.

— Такім чынам, гандляр абавязаны заключыць дамову куплі-продажу на ўмовах, размешчаных на сайце інтэрнэт-крамы, у момант заказу тавару спажыўцом. А як ён гэта зрабіў — паклаўшы ў віртуальны кошык,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)



> Перш за ўсё неабходна высветліць, ці зарэгістравана інтэрнэт-крама ў Гандлёвым рэестры нашай краіны, а яе даменнае імя — у нацыянальнай даменнай зоне .by, .бел — гэта галоўная ўмова існавання такога віду гандлю ў Беларусі.

патэлефанаваўшы ці іншым спосабам, — не мае значэння, — кажа Іна Гаўрыльчык. — Тавар павінен быць прададзены па цане, якая была заяўлена на сайце на момант заказу яго спажыўцом. Гандляр не мае права змяняць умовы дамовы куплі-продажу пасля атрымання заказу.

## Варыянты вырашэння спрэчкі

Калі такая сітуацыя ўсё ж такі здарылася (як у выпадку з нашым чытачом), што рабіць? Ёсць некалькі шляхоў для вырашэння праблемы, кажа прадстаўнік Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Першы — звярнуцца да гандляра з пісьмовай прэтэнзіяй, пазначыўшы патрабаванне аб продажы тавару па той цане, па якой спажывец заказваў тавар, з прыкладаннем дакументаў, якія гэта пацвярджаюць. Накіраваць гэтае патрабаванне трэба на пошту з апавяшчэннем ці на электронную пошту. Алгарытм пісьмовай прэтэнзіі можна таксама рэалізаваць праз запіс у кнізе заўваг і прапаноў гандляра.

Другі варыянт — звярнуцца ў мясцовы выканкам (ці адміністрацыю раёна) для ўрэгулявання спрэчкі ў дасудовым парадку ці складання іскавай заявы ў суд (дзяржаўная абарона спажыўцоў). Дарэчы, звяртацца можна ў свой выканкам ці выканкам, да якога адносіцца па тэрытарыяльным прынцыпе гандляр.

Трэці — звярнуцца ў грамадскае аб'яднанне ахловы правоў спажыўцоў (грамадская абарона спажыўцоў).

І апошні варыянт — самастойна звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб прымушэнні заключыць дамову на першапачатковых умовах або скарыстацца паслугамі адваката.

## Давер напавер каштуе дорага

Сярод падводных камянёў ёсць яшчэ адзін, які спажыўцам трэба ведаць, — і датычыцца ён спосабу аплаты. Спецыяліст звяртае ўвагу на тое, што сустракаюцца выпадкі, калі інтэрнэт-крама афармляе заказ на дастаўку тавараў, выбраных і адкладзеных у «кошык», толькі на ўмовах анлайн-аплаты банкаўскай карткай, гэта значыць у безнаяўным выглядзе. Некаторыя інтэрнэт-гандляры ажыццяўляюць продаж тавараў на ўмовах папярэдняй аплаты. Ці можна лічыць гэта правільным?

— Згодна з законам «Аб ахове правоў спажыўцоў» пакупнік мае права разлічвацца як



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

### ШТО КУПЛЯЕМ АНЛАЙН?

**Згодна са звесткамі Белстата, аб'ём тавараабароту інтэрнэт-крамаў у 2018 годзе склаў 1,47 мільярда рублёў. Доля тавараабароту віртуальных крамаў у агульным тавараабароце дасягнула 3,7 %.**

«МС» пацікавілася ў Гандлёвым рэестры, што цяпер прадаецца ў інтэрнэт-крамах? Як высветлілася, наступныя групы тавараў:

харчовыя тавары — 844 інтэрнэт-крамы (3,6 % ад агульнай колькасці віртуальных крамаў);
нехарчовыя тавары — 22 764 крамы (96,4 %);
бытавыя электратавары — 5435 (23 %);
тэлерадыётавары — 2119 (9 %);
адзенне шытае — 1811 (7,7 %);
адзенне трыкатажнае — 1727 (7,3 %);
тэлекамунікацыйнае абсталяванне — 1426 (6 %);
абутак — 1189 (5 %).

Адзначым напрыканцы, што некаторыя інтэрнэт-крамы гандлююць некалькімі тапарнымі групамі адначасова.

у наяўнай, так і ў безнаяўнай форме, а гандляр павінен даць спажыўцу права выбару формы аплаты, — кажа суразмоўніца. — Таму адсутнасць магчымасці ў спажыўца разлічыцца наяўнымі грашыма ў інтэрнэт-краме з'яўляецца неправамернай.

Між іншым, таксама гандляр не мае права замацоўваць розныя цэны ў залежнасці ад формы аплаты тавару.

Што датычыцца інтэрнэт-продажу на ўмовах папярэдняй аплаты, то трэба сказаць, што дамовай куплі-продажу можа быць прадугледжаны розны спосаб аплаты: ці непасрэдна ў момант перадачы тавару спажыўцу, ці праз нейкі час пасля перадачы тавару (то-бок продаж у крэдыт), ці папярэдняя аплата замоўленага тавару — гэта не пярэчыць сённяшняму заканадаўству.

— Але, мяркую, гандлюючы праз інтэрнэт-крамы на ўмовах перадаплаты, можна страціць частку сваіх кліентаў — не ўсе гатовыя плаціць 100 % кошту тавару да таго, як яны яго атрымаюць, — разважае суразмоўніца.

# АСВАЕННЕ АНЛАЙН-

**У асабістым кабінеце маёй электроннай пошты рознакаліебрнымі маркетынгавымі «пушкамі» рабочаму настрою час ад часу пагражае рэклама. Бывала, біла так, што балюча адбівалася ў кішэні. Дзве гісторыі куплі адзення праз інтэрнэт за адзін месяц.**

На віртуальных паліцах анлайн-крамы вядомымі лэйбламі вабіў сэканд-хэнд і стокавы тавар. Асартымент для матуль, татаў і дзяцей розных узростаў. Стасункі з новай анлайн-крамай лепш пачаць з рэчаў недарагіх, вырашыла я. Выбралі з дачкой добрую (па фота) блузку для школы. Выглядала як новая, толькі без цэтліка. Аформіць заказ не змагла — усплыло папярэджанне: адпраўляем толькі пры вазе спажывецкай карзіны не менш, чым 15 рублёў. Блузка тая была і так самай таннай у даччыным роставым сегменце, а знайсці штосьці карыснае і недарагое складана. Тут бы спыніцца.

Не, спрацавала мацярынскае жаданне набыць іншую рэч і для малодшай — сёстры ж разам будуць адкрываць пасылку. Унутраны шапаголік-пачатковец суцяшаў: «Так, нічога з выбранага цяпер не патрэбна, але ж няхай навырост будзе — некалі спатрэбіцца». Дзве рэчы «заважылі» крыху больш за 15 рублёў. Потым трэба было вызначыць, якім чынам я атрымаю пасылку. Выбрала аплату па факце на пошце.

Праз два дні на мабільнік «ціўкнула» паведамленне ад сэрвісу дастаўкі: «На ваша імя прыбыло адпраўленне, перайдзіце па спасылцы для выбару даты і часу дастаўкі». Быў пазначаны і тэлефон для даведкі, але не пошты. Я чамусьці патэлефанавала не па ім, а сяброўцы, якая дзвюх дачок доўгі час апранае праз анлайн-сэканд-хэнды. Пыталася ў яе, што за паслуга па дастаўцы, колькі каштуе. Яна запэўніла, што ў яе на пошце ёсць такая практыка: паштальён дастаўляе да дзвярэй, ты аддаеш грошы за пасылку, плюс кошт перасылкі і пэўную суму за дастаўку.

На памяць прыйшла мая паштальёнка Клаўдзія, што носіць газету. Думаю, добра, падтрымаю сваё паштовае аддзяленне платнай паслугай. Да таго ж, сітуацыя эпідэміялагічная, чаго лішні раз выпрабоўваць здароўе ў чарзе?

Праз колькі гадзін патэлефанавалі. Не Клаўдзія. У трубцы кур'ер сэрвісу дастаўкі ўдакладніў адрас і папярэдзіў, што хутка будзе. Прыехаў на машыне, аздобленай лагатыпамі буйной гандлёвай сеткавай кампаніі. Запатрабаваў пашпарт, працягнуў дакумент, каб запоўніла, пасля дадаў: «З вас 22 рублі».

Аддала. Дома дзеці патрашылі пакунак, а мяне біла ў скроні — вось, купіла блузачку. Пачалася спажывецкая рэфлексія. Узнікла жаданне на касцы перакласці частку адказнасці за такі анлайн-шопінг. Расло абурэнне, у галаве віраліся пытанні да невядомага прадаўца: чаму не папярэдзілі, колькі будзе каштаваць паслуга дастаўкі кур'ерам, адкуль у сэрвісу дастаўкі мае пашпартныя даныя, як цяпер пасрэднік гэты пераведзе грошы прадаўцу, бо гэта ж не плацеж па пошце.

На другі дзень вырашыла разабрацца: ці магла я, як спажывец, адмовіцца ад пасылкі. Мне ж не была загадзя растлумачана поўная інфармацыя аб паслузе.

Як казала мая бабуля, усе разумныя задам. Толькі цяпер я ўнікла ў інфармацыю на сайце прадаўца, дзе вельмі падрабязна тлумачацца ўсе нюансы дастаўкі і іх кошт. Адмовіцца ад пакупкі немагчыма, бо на сайце ёсць памеры рэчаў, іх шматлікія фатаграфіі і апісанне. Пункт незвароту — націск на кнопку «аформіць заказ».

Прадаўцу можна было б паставіць у віну толькі непрыхаваную рэкламу сэрвісу дастаўкі пасылкі ў процівагу традыцыйнаму паштоваму адпраўленню, карысць для пакупніка якога анлайн-крама ставіла пад сумненне. Кошт дастаўкі трэба абавязкова ўдакладніць самастойна загадзя.

Пасля анлайн-шопінгу было адчуванне, што мяне надурылі: спрацавалі маркетынгавыя прынады.

Тэлесеткі

# ЯК НА ПАЛЕССІ ВОДЗЯЦЬ «КУСТУ» І ХЛЕБ ПЯКУЦЬ

**20 чэрвеня творчая група праграмы «Жывая культура» запрашае гледачоў «Беларусь 3» паназіраць за старадаўнім абрадам «Ваджэнне Кусты», запіс якога адбыўся на свята Святой Тройцы ў аграгарадку Лобча Лунінецкага раёна.**

Здымачная група сацыякультурнага тэлеканала разам з вядучай Кацярынай Ваданосавай працягваюць ствараць жывую відэаэнцыклапедыю па старонках спіса нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Чарговым пунктам назначэння творчай экспедыцыі стаў аграгарадок Лобча, дзе дагэтуль на другі дзень Святой Тройцы мясцовыя жыхары ладзяць старажытнаславянскі абрад — «Ваджэнне Кусты».

«Кустай» палешукі з даўніх часоў называюць дзяўчыну, адну з самых прыгожых у вёсцы, у святочны дзень абвітую паверх традыцыйнага адзення галінкамі і свежым зялёным лісцем, з вялікім вянком на галаве — яна сваім вобразам увасабляе не толькі юнацтва, але і непарыўную сувязь з продкамі. Праз абрад, які суправаджаецца шанавальнымі траецкімі спевамі, дзяўчына далучаецца да жанчын старэйшага пакалення і сімвалічна ўваходзіць у дарослае самастойнае жыццё. Святочная працэсія на чале з «Кустай» наведвае сялянскія двары, жадаючы гаспадарам здароўя, дабрабыту і багатага ўраджаю. Лічыцца, што там, дзе пабывала «Куста» на Святую Тройцу, усё будзе добра, і таму паўсюль ёй адчыняюць дзверы.

Убачыць аўтэнтычны абрад тэлегледачы сацыякультурнага тэлеканала змогуць у суботу, 20 чэрвеня, а 10-й гадзіне. А 27 чэрвеня ў новым выпуску праграмы тэлегледачы даведаюцца пра традыцыю выпечкі грачанага хлеба ў вёсках Маларыцкага раёна.

Нагадаем, што праект «Жывая культура» выходзіць на «Беларусь 3» з чэрвеня 2018-га. За гэты час свет убачыла больш за 50 арыгінальных выпускаў. Кожная новая праграма распавядае пра асобны элемент спіса нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў, уключанага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі (сёння ён складаецца з 92 элементаў). У далейшым творчая група «Жывой культуры» планує ахапіць усе элементы спіса, а таксама тыя, што будуць дапаўняцца з цягам часу.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 96

Аўтар наступнай мініяцюры — Аляксей Петрусенка ***(гл. дыяграму).***



Белыя: Кре3, Фе5, Лс7, пh2 (4).

Чорныя: Крg4, пп. g6, h4 (3).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Прааналізуем яшчэ адну з кампазіцый беларускай каманды на Кубку гарадоў-герояў, пра які мы расказалі ў мінулым выпуску. Задача Віктара Волчака падзяліла 3—5 месцы.

Белыя: Крh4, Фа5, Лс3, Лg5, Cb2, Cf1, Kb4, Kh5, пп. a3, d2 (10).

Чорныя: Кре4, Фа2, Лd8, Ле8, Сс8, Cf8, Kg8, Kh1, пп. b3, b7, c2, c5, d5, e5, f4, h3 (16).

Мат за 4 хады.

Падманны след: 1. Фс7? ~ 2. Фh7+ (1... Ф:b2 2. Фh7+ Cf5 3. Ф:f5+ Крd4 4. Фd3х), 1... Лd7 2. Ле3+ fe 3. d3+ Крf3 4. Лf5х; 1... Ле7 2. Се2! с1К 3. Cf3+ Крd4 4. Ф:c5х, 1... Се7 2. Ф:е5х, але 1... Cd7!

Рашае 1. Фb6! ~ 2. Фg6+/2. Фf6! K:f6 3. K:f6+ Крd4 4. Лс4х, 2... c4 3. Л:e5+ Л:e5 4. Ф:f4х (1... Ф:b2 2. Фg6+ Cf5 3. Ф:f5+ Крd4 4. Фd3х, 1... Kg3 2. K:g3+ fg 3. Ле3+ Крf4 4. Kd3х), 1... Cd6 2. Фb5! c1K 3. Л:c1! c4 4. Ф:d5х (2... Kf2 3. Фе2+ Крd4 4. Лс4х), 1... Лd6 2. Се2! с1К 3. Cf3+ Крd4 4. Ф:c5х (2... Cg4 3. Ле3+ fe 4. d3х), 1... Ле6 2. Ле3+ fe 3. d3+ Крf3 4. Лf5х, 1... Се6 2. Л:e5+ Кр:e5 3. Ле3+ Крf5 4. Cd3х

* * *

Міжнародная федэрацыя шахматнай кампазіцыі правяла анлайн-турнір для рашальнікаў, якія маюць рэйтынг 2300 і вышэй. За дзве гадзіны трэба было рашыць 8 заданняў. Перамог малады расійскі грос-майстар Даніла Паўлаў. З беларусаў найлепшы быў Аляксандр Булаўка — 19—20 месцы пры 67 удзельніках.

* * *

У анлайн-турніры Беларускай федэрацыі шахмат у гонар 75-годдзя Перамогі прызавую тройку склалі Дзяніс Лазавік, Максім Царук і Арцём Стрыбук. Маладзёжная зборная Беларусі (да 16 гадоў) згуляла ў інтэрнэце бліц-матч з такой жа камандай Расіі і саступіла з лікам 102:136. Уладзіслаў Кавалёў у буйных міжнародных анлайн-бліц-турнірах быў трэці з 1007 удзельнікаў і дзевятнаццаты з 1084. Аляксей Фёдараў заняў шостае месца ў Мемарыяле Чабаненкі, які правяла анлайн федэрацыя шахмат Малдовы.

Міжнародная шахматная федэрацыя зладзіла анлайн «Кубак нацый» па хуткіх шахматах з удзелам шасці каманд. У выніку месцы размеркаваліся так: 1. Кітай; 2. ЗША; 3. Еўропа; 4. Расія; 5. Індыя; 6. Астатні свет.

А вось як дзеючы чэмпіён свету перамог у адным з анлайн-турніраў маладога іранскага грос майстра.

Магнус Карлсен — Аліраза Фіруджа. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kf3 d5 4. Kc3 Cb4 5. cd ed 6. Cf4 0-0 7. e3 Cf5 8. Фb3 Kc6 9. Kh4 Ce6 10. Cd3 a5 11. 0-0 Kh5 12. Cg3 K:g3 13. hg Ce7 14. Kf3 Kb4 15. Ce2 c5 16. a3 c4 17. Фd1 Ka6 18. b3 Kc7 19. bc dc 20. a4 Cb4 21. Фc2 C:c3 22. Ф:c3 Kd5 23. Фa3 Лc8 24. Лfc1 Kb4 25. Лc3 Kd5 26. Лcc1 Kb4 27. Ke5 c3 28. Kd3 Фb6 29. Лab1 Cf5 30. Лb3 C:d3 31. C:d3 c2 32. Л:c2 Л:c2 33. C:c2 Фc6 34. Cf5 Фd5 35. Cg4 Kc2 36. Фb2 Kb4 37. Лc3 b6 38. Ce2 Фf5 39. Лc1 g6 40. Cb5 Лc8 41. Л:c8+ Ф:c8 42. Фd2 Фf5 43. f3 Фg5 44. Крf2 Kd5 45. Фd3 h5 46. e4 Kb4 47. Фe3 Фf6 48. Фc3 Крh7 49. f4 Фe6 50. Фc4 Ф:e4 51. Ф:f7+ Крh6 52. Фf6 Крh7 53. Фe5 Фc2+ 54. Крg1 Фd2 55. Крh2 Kc2 56. Фe7+ Крh6 57. Фf8+ Крh7 58. Cc4, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kd5! Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# 400 крокаў у даўніну

**Ужо восем сезонаў праграма «Наперад у мінулае» збірае каля экранаў прыхільнікаў беларускай народнай песні. А 12 ліпеня ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гледачоў чакае юбілейны, 400-ы выпуск праекта — і, значыць, ужо чатыры сотні народных песень набылі новае гучанне. Яго тут ствараюць дзякуючы сучасным аранжыроўкам — з праграмай у розны час супрацоўнічалі Юрый Вашчук, Кірыл Ермакоў, Максім Осіпаў, Арцём Кандрацюк, Сяргей Сухамлін і іншыя творцы.**

Як успамінаюць стваральнікі праекта Аксана і Анатоль Вечар, пачалося ўсё, можна сказаць, выпадкова. Калісьці Анатоль працаваў рэжысёрам-пастаноўшчыкам дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне» — і аднойчы аўтар Алена Будрыцова вырашыла зрабіць дуэты юных артыстаў і іх ужо вопытных, дарослых калег, а аранжыроўкі на песні стварыў Юрый Вашчук. Тады ў Анатоля ўзнікла ідэя зрабіць сімбіёз фолку і сучасных апрацовак. Калі працавалі над пілотным праграмы «Наперад у мінулае», то ўзялі ў спадарожнікі сябра па Інстытуце культуры Аляксандра Сухарава з гітарай, у якасці аднаго з вядучых — Юрыя Вашчука. Таксама Анатоль дамовіўся са сваім аднакурснікам Валерыем Мазурам, і ўся кампанія накіравалася ў вёску Маршалкі. Там паслухалі бабулек, паразмаўлялі з імі і выбралі песню. «Мяшчаначка» і стала песняй № 1. Пілот зацвердзілі, і 7 студзеня 2012-га «Наперад у мінулае» выйшла ў эфір.

— Самае цудоўнае — гэта людзі. Прызнанні ад бабулек кшталту: «Вось прыехала да нас «Наперад у мінулае», можна і паміраць...» ці: «Стаю ў агародзе, палю гарох, думаю, трэба ж аўтакраму не прапусціць, а пасля зірнула на гадзіннік — якая аўтакрама, калі «Наперад у мінулае» пачынаецца!» — дарагога вартыя, — дзеліцца Аксана Вечар. — Увогуле адчуванне, што робім патрэбную справу, вельмі натхняе. Калі прыязджаем — нас сустракаюць быццам родных. За гады існавання праекта мы спрабавалі па-рознаму ўвасабляць свае ідэі: спярша проста запісвалі песні да апо-веды пра ранейшае жыццё, а з часам пачалі здымаць абрады, што дадало праграме дынамікі. Заўжды зазначалі галоўнае: паспець занатаваць тое, што захавалася ці ўжо паспелі аднавіць. Прыемна адзначаць, калі ў пэўных раёнах, куды мы з'ездзілі, абяцаюць: маўляў, паходзім яшчэ па вёсках, параспытваем, можа, хто што помніць цікавае, тады зробім і вас запросім. Так, напрыклад, у Віцебскім раёне абяцалі масленкавы абрад «Шыла куваць» для нас аднавіць, цяпер яго чакаем. Акрамя тэлевізійнага эфіру, увесь запісаны матэрыял выкладваецца на YouTube, і такім чынам мы ствараем пэўную анталогію беларускага фальклору. Бо ў гэтай справе галоўнае — не сядзець і не бяздзейнічаць. І тое, што адчуваем удзячнасць, прыязджаючы ў вёскі, — таму пацвярджэнне.



За восем гадоў існавання праекта творчая група «Наперад у мінулае» ў кампаніі з артыстамі айчыннай эстрады праехала ўсю краіну — амаль 100 раёнаў, у тым ліку пагранічныя вёскі, дзе аўтаматычна падключаўся роўмінг іншых краін (напрыклад, Ляплёўка Брэсцкага раёна — 423 кіламетры ад Мінска, Свяцілавічы Веткаўскага — 372 кіламетры, Казлы Ельскага — 370 кіламетраў, Сенькава Верхнядзвінскага — 310 кіламетраў). Дарэчы, карэспандэнты «Звязды» таксама пачынаючы з 2014 года на працягу некалькіх сезонаў былі ўдзельнікамі некаторых фальклорных вандровак, пра што расказвалі на старонках газеты. Кожная паездка са здымачнай групай праграмы давала магчымасць здзейсніць і музычнае, і геаграфічнае, і часавае падарожжа. Бо знаёмства з гарадамі і вёскамі Беларусі, дзе збіраюць і старанна захоўваюць песенную спадчыну, абрады і традыцыі продкаў, выклікае роздум пра жыццё мінулае і сучаснае, пра лёсы людзей і іх унутраны свет, які, нібы ў люстэрку, знаходзіць сваё адлюстраванне ў песні...

Там можна і пачуць аповед пра цяжкую долю, і даведацца, як умелі кахаць і па якіх правілах будавалі сямейнае жыццё, на што арыентаваліся ў побыце і як адзначалі святы і многае іншае. Словам, не знайсці лепшай крыніцы жыццёвай мудрасці і яе носьбітаў.

Па ўмовах праекта, фальклорныя калектывы выконваюць шэраг песень — народных кампазіцый (іх, між іншым, за ўвесь час існавання праграмы было запісана прыкладна 2,5 тысячы!). А напрыканцы кожнай праграмы ўвазе гледачоў прадстаўляецца новая версія народнай песні ў сучаснай аранжыроўцы, якую выконваюць вядомыя беларускія артысты. Наноў адраджалі гэтыя песні больш за 250 гуртоў і выканаўцаў — ад пачаткоўцаў на вялікай сцэне да заслужаных і народных. Адзін з аранжыроўшчыкаў праекта Кірыл Ермакоў неяк прызнаўся, што яму асабліва цікава працаваць з аўтэнтычным матэрыялам: «...У працэсе я дакранаюся да фальклорнай спадчыны. У ёй нашы карані, і, захоўваючы архаіку, мы зберагаем памяць пра мінулае і яго здабыткі. Інтарэс да такой музыкі ёсць не толькі ў нас, але і за межамі нашай краіны. Напрыклад, мы рабілі для Юзары песню на аснове такога матэрыялу, і ён выканаў яе на сваім канцэрце ў Германіі. Публіка была ў захапленні! Мне гэта карысна і ў плане вопыту, бо я надаю новае гучанне песням, якія складваліся вякамі».

Юбілейны выпуск праекта «Наперад у мінулае» выйдзе ў нядзелю, 12 ліпеня, а 10-й раніцы. Аксана Вечар расказала, чым будзе адметны святочны эфір: «Прыхільнікі нашай праграмы заўважаць, што чатырохсоты выпуск па форме будзе нагадваць першы: разам са здымачнай групай у фальклорную экспедыцыю накіруюцца кампазітар, аранжыроўшчык Сяргей Сухамлін, а таксама спявак, музыкант, кампазітар Аляксандр Сухараў. У рэжыме анлайн яны выберуць песню, на якую і створаць новае музычна-вакальнае адзіночанне».

На гэтым творчая група праекта не спыняецца. Аўтары перакананыя: кожную вёску можна наведваць шмат разоў і заўсёды вяртацца ў студыю з новым матэрыялам — запісамі народных песень і кадрамі аўтэнтычных беларускіх абрадаў. Планаў у стваральнікаў праекта безліч — і зрабіць мюзікл, і арганізаваць вялізную канцэртную праграму, а галоўнае, працягваць работу з народнымі песнямі і з людзьмі, якія зрабілі справай свайго жыцця іх захаванне і перадачу нашчадкам.

**Алена ДРАПКО, фота аўтара.**

## Беларусь 1

6.45 Існасць [СЦ].
**7.10 Меладрама «Зусім чужыя». 1-я серыя (12+).**
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
9.10 Сэнс жыцця. Андрэй Жышкевіч (12+).
9.45 Здароўе (12+) [СЦ].
10.35 Дача (12+).
**11.10, 12.10 Меладрама «Мая ідэальная мама» (12+).**
15.15 Краіна.
20.00 «Макаёнка, 9».
21.00 Панарама.
21.45 «На кантролі Прэзідэнта».
**22.00 Меладрама «Крытычны ўзрост». 1-я і 2-я серыі (12+).**
2.00 Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.55 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
8.35 М/с «Цімон і Пумба» (0+).
9.20, 21.05 Тэлебарометр.
9.25 Анімацыйны фільм «Маленькі прынц» (0+).
11.05 «Вежа» (12+).
11.50 Капейка ў капейку (12+).
12.25 Камень, нажніцы, папера (16+).
12.55 «Веру не веру» (16+).
13.45 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**14.15 Меладрама «Пад сонцам Тасканы» (16+).**
16.05 «Мяняю жонку» (16+).
17.45 «Вяселле ўсляпую» (16+).
**19.10 Прыгоды «Прынц Персіі: Пяскі часу» (12+).**
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15 Баявік «Вартавыя Галактыкі» (12+).**
23.15 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).

## Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
**8.00, 13.45, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 14.10, 20.35** Гэты дзень.
**8.25 «Жыццё і надзвычайныя прыгоды Рабінзона Круза». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Жывая культура». Абрад «Ваджэнне Кусты» (Лобча, Лунінецкі раён, Брэсцкая вобласць).
10.25 «Беларуская кухня». Сашэнь.
**10.55 «Лятучая мыш». Маст. фільм (12+).**
13.20 «Навукаманія» (6+).
**14.15 «Чатыры танкісты і сабака». Серыял (12+).**
17.20 Госці «Славянскага базару — 2019». Канцэрт.
**18.20 «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу дрэннае надвор'е». Маст. фільм (12+).**
20.00 «Суразмоўцы». Уладзімір Ліпскі.
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
22.25 «Легенды кіно». Анатоль Папанаў (12+).
23.05 К. Крапіва. «Брама неўміручасці». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

## Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 14-ы тур. ФК «Слуцк» — «Нёман» (Гродна).
9.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Норвіч» — «Саўтгэмптан».
11.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
11.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. ХК «Мінск» — ХК «Рытм».
13.20 Вось гэта спорт!
13.35 Вялікі спорт.
14.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Уотфорд» — «Лестэр».
16.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 14-ы тур. «Іслач» (Мінскі р-н) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна). (У перапынку Спорт-цэнтр.)
17.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 14-ы тур. «Дынама» (Брэст) — ФК «Гарадзея». (У перапынку Спорт-цэнтр.)
19.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 14-ы тур. «Дынама-Мінск» — РЦАР-БДУ (Мінск). (У перапынку Спорт-цэнтр.)
21.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Борнмут» — «Крыстал Пэлэс». (У перапынку Спорт-цэнтр.)
23.45 Трэніровачны дзень.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
7.45 «Непуцёвые нататкі» (12+).
8.25 «Мэта 99. Дом без адхода» (16+).
9.10 «Юрый Саломін. Больш, чым артыст» (6+).
**10.20 Камедыя «Пёс Барбос і незвычайны крос» (6+).**
10.30 «Бачылі відэа?» (6+)
12.55 «На дачу!» (6+)
**14.10 Фантастыка «Чалавек-амфібія» (6+).**
16.20 «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
17.50, 21.10 «Сёння ўвечары» (16+).
20.00 «Нашы навіны». Суботні выпуск.
20.45 «Метэагід».
**23.25 Маст. фільм «Дзьмухавец» (16+).**

## СТБ

6.10 «Жывая тэма» (16+).
7.50 «Анфас».
8.10 «Самая карысная праграма» (16+).
9.05, 11.00 Дакументальны праект (16+).
10.00 «Мінск і мінчане».
10.30 «Цэнтральны рэгіён».
**11.40, 13.40 «Жоўтае вока тыгра». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
20.00 Дакументальны спецпраект (16+).
20.55 «Тэрыторыя памылак» (16+).
**22.20 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+).**
1.35 «Жывая тэма» (16+).

## МІР

**6.00 Серыял «Забыты» (16+).**
**6.35, 7.50, 5.10** Мультфільмы (6+).
7.20 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
8.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання». А золкі тут ціхія (паўтор) (0+).
9.05 Шоу «Слабае звяно» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «А золкі тут ціхія» [СЦ] (12+).**
**14.05, 16.15, 19.15 Серыял «Жукаў» (12+).**
3.10 Дак. фільм «Маршалы Перамогі». Георгій Жукаў (12+).
**3.35 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Красуні» (12+).**
10.30 «Па сакрэце ўсяму свету».
11.00 Весткі.
11.25 «Сто да аднаго».
**12.15 Маст. фільм «Эгаіст» (12+).**
14.05 «100ЯНАЎ». Шоу Юрыя Стаянава (12+).
15.10 «Доктар Мясніkоў» (12+).
**16.15 Маст. фільм «Дачка за бацьку» (12+).**
19.45 «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.50 «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**22.35 Маст. фільм «Адзіная радасць» (12+).**

## НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 Сёння. Галоўнае.
6.15 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
6.45 «Гісторыі рамонту» (0+).
7.20 «Дача» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «НЗ.by: Час вынікаў».
8.55 «Гарады Беларусі» (6+).
9.25 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
10.25 Галоўная дарога (16+).
11.00 «Жывая ежа» (12+).
11.50 Кватэрнае пытанне (0+).
12.50 Паедзем, паядзім! (0+)
13.35 Гісторыі выратавання (12+).
**14.05 Маст. фільм «Хто я?» (16+)**
16.25 «Сакрэт на мільён». Браты Запашныя (16+).
18.05 «Следства вялі...» (16+).
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.40 Маст. фільм «Падлягае знішчэнню» (12+).**
0.35 «Вялікая вайна» (16+).

## 8 канал

**7.00, 14.55, 18.45, 21.15** «Надвор'е» + «Эрана».
7.10 Мультфільм «Сямейка Адамс» (12+).
8.40, 16.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
8.45 «Прызнайся, што смачна!» (6+)
**9.05 Камедыя «Жылі-былі».**
**10.35 Драма «Два жыцці».**
**15.00 Глядзім усёй сям'ёй. «Кліч продкаў» (6+).**
**16.50 Камедыя «Брыльянтавая рука».**
**18.50 Камедыя «Апошні волат».**
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.20 Трылер «Вайна бясконцасці» (12+).**
**23.25 Трылер «Людзі ў чорным-2».**
1.00 «Надвор'е».





## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.20 «Леві момант» (16+).
8.35 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**10.00, 21.00** Серыял «Кухня» (16+).
11.30 Серыял «Анжаліка» (16+).
**12.30, 22.30** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
13.55 «Ералаш» (6+).
14.25 «Галілеа» (12+).
15.00, 0.55 Серыял «Маладзёжка» (16+).
17.00 Серыял «Варонiны» (12+).
**19.00, 0.00** «Уральскія пельмені» (16+).
20.00 Серыял «Выжыць пасля» (16+).
2.35 «Хачу верыць!» (16+)
3.50 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30 «Лісты з правінцыі». Смаленск [СЦ].
7.00 «Легенды сусветнага кіно». Рына Зялёная.
7.35, 2.30 Жыццё выдатных ідэй. «Алмазная ліхаманка» [СЦ].
8.05, 13.20, 19.45 «Восем дзён, якія стварылі Рым». Дак. серыял [СЦ].
8.50, 0.00 XX стагоддзе. «Ведай нашых! Фільмы Эльдара Разанава». Кінагульня. 1992 год.
9.40, 0.50 Прыгожая планета.
10.00, 21.25 «Пакой Марвіна». Маст. фільм.
**11.40, 23.05** Оперныя тэатры свету з Мікалаем Цыскарыдзэ. «Парыжская нацыянальная опера».
12.35 Academia. Сымон Шноль. «Біялагічныя гадзіны».
14.05 Штучны адбор.
14.45 Спектакль Аляксандрынскага тэатра «Рэвізор».
17.00 «Дом палярнікаў». Дак. фільм.
17.45, 1.05 Інструментальныя ансамблі. Дзмітрый Аляксееў, Мікалай Дзэмідзенка.
18.35 «Артэку» — 95! «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
19.00, 1.50 Кіно пра кіно. «Плюмбум. Металічны хлопчык». Дак. фільм [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Штучны адбор.

## Настальгія

6.00 Маст. фільм «Таямніца Снежнай каралевы» (12+).
8.20 Канцэртная праграма «Госці з Сан-Рэма». 1992 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Міну-лы час» (12+).
**9.45, 11.20, 13.15, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 1.20, 2.40, 3.50, 5.20** Музычная настальгія. (12+).
10.00 «Вакол смеху» з Аляксандрам Івановым. 1985 год (12+).
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. Led Zeppelin. 2004 год (18+).
13.00 Маст. фільм «Ліст у Амерыку» (18+).
13.40 Маст. фільм «Пра цябе» (16+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Палітkоўскім: «Пачатак перабудовы: «сухі» закон». 2006 год (18+).
18.50 Маст. фільм «Вадапуск, які не адбыўся» (16+).
20.05 Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год (12+).
0.00 Маст. фільм «Хлопец з нашага горада» (12+).
1.40 Маст. фільм «Людзі і манекены» (12+).
3.00 «Быў час». 2009 год (16+).
4.00 Маст. фільм «Гамбрынус» (18+).

## EuroSport 1

0.00 Аўтагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана» — 2019 (12+).
1.30 Аўтагонкі. Геймінг. Ле-Ман (12+).
2.30, 12.30 Снукер. «Мастэрс»-2019 (6+).
**6.00, 23.30** Мотагонкі. FIM Endurance. Тэлечасопіс All Access (12+).
6.30 Мотагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана» — 2018 (12+).
8.00 Мотагонкі. FIM Endurance (12+).
9.30 Тэніс. Агляд (6+).
15.00 Веласпорт. «Джыра д'Італія» — 2018 (12+).
16.00 Веласпорт. «Тур дэ Франс» — 2018 (12+).
17.30 Веласпорт. Лондан — Сурэй Класік — 2018 (12+).
18.00 Веласпорт. «Вуэльта»-2017 (12+).
18.55 Футбол. Чэмпіянат Нарвегіі (6+).

## Кінакамедыя

0.40 Найноўшы запавет (16+).
2.45 Новыя прыгоды Аладзіна (6+).
4.35 Джунглі (6+).
6.00 Зводныя браты (18+).
7.55 Заліковы выкладчык-3 (18+).
10.10 Ну што, прыехалі? (12+)
12.05 Ну што, прыехалі: рамонт (12+).
13.45 Дзевяць ярдаў (16+).
15.45 Вялікі тата (12+).
17.30 Душэўная кухня (16+).
19.30 Кабельшчык (16+).
21.20 Дапамажыце стаць бацькам (16+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.00 М/ф (6+).
**8.45, 23.30** «Улегцы» (12+).
9.15, 17.35 «Сны» (16+).
**10.10, 15.30, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.10, 18.35, 3.15 «Сляпая» (16+).
12.15, 19.45 «Варажбіт-ка» (16+).
13.20 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.20, 2.20 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.35 «Знакі лёсу» (16+).
20.55 «Менталіст». Серыял (16+).
22.45 «Дубль два». Серыял (16+).
0.00 «90-я». (16+).
0.45 «Таемнае акно». Маст. фільм (12+).
4.10 «Перыскоп» (16+).

## ТБ1000

6.10 Неверагоднае падарожжа містара Співета (6+).
8.05 Цуд (12+).
10.00 Кон-Цікі (6+).
12.00 Аднойчы ў Амерыцы (16+).
16.00 Прадчуванне (16+).
17.45 Востраў праклятых (16+).
20.10 Ілюзія падману-2 (12+).
22.25 Ідэальныя ўцёкі (16+).
0.05 Свецкае жыццё (18+).
1.45 Каханне з першага погляду (18+).
3.05 Знаёмцеся, Джо Блэк (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

7.45 Міфы (16+).
9.40 Хлопец з нашых могілак (12+).
11.20 Тарас Бульба (16+).
13.40, 19.00 Вольф Мессінг: хто бачыў скрозь час (12+).
15.30 Яраслаў. Тысячу гадоў таму (16+).
17.20 Без меж (12+).
20.45 Дзень выбараў (16+).
23.00 Дзень выбараў-2 (12+).
1.20 Кандагар (16+).
3.25 Кіроўца для Веры (16+).
5.30 Фота на памяць (16+).

## National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25 Ледзяная дарога (16+).
7.10 Тэхаскі ўлоў (16+).
8.45 Суперкар са смецціка (16+).
9.30 Царства мумій (16+).
10.15 Асушыць акіян (16+).
11.55, 1.55 Аўта-SOS (16+).
12.40 Мегазлом-4 (16+).
**13.30, 21.15, 2.40** Расследаванне авіякатастроф (16+).
15.00, 3.30 Ліхтугі за мяжой (16+).
17.25 Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**18.10, 22.05, 1.10, 4.20** Самыя лепшыя суперкары (16+).
19.45 Зямля пад рэнтгенам (16+).
20.30 Секунды да катастрофы (16+).
22.50 Суперэзбудаванні: цуды інжынерыі (16+).
0.20 Цуды інжынерыі (16+).
5.10 Інжынерныя ідэі (16+).

## Discovery

8.00 Перш за ўсё — самалёты (12+).
8.45 Дальнабойшчык у В'етнаме (12+).
**9.35, 17.55, 2.40** Гаражны рамонт (16+).
**10.25, 16.15, 22.10** Махінатары (12+).
**11.15, 18.45, 4.15** Багажныя войны (12+).
12.05 Склады: бітва ў Канадзе (12+).
12.55 Механізмы да Вінчы (12+).
13.45 Геній аўтадызайну (12+).
14.35 Пагляд знутры: West Coast Customs (12+).
15.25, 7.15 Хуткія і гучныя (12+).
17.05 Як гэта ўстроена: аўтамабілі мары (12+).
**17.30, 21.15, 5.00** Як гэта зроблена? (16+)
**19.35, 5.45** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
20.25 Роб Рылг даследуе свет (12+).
23.05 Паляўнічыя на склады (16+).
0.00 Узрываючы гісторыю (12+).
0.55 Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
1.50, 6.30 Голыя і напалоханыя (16+).
3.30 Сакрэтныя базы нацыстаў (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50** Дзень у вялікім горадзе.
**11.50, 12.10, 13.05, 18.40, 19.20 Меладрама «Адчайныя» (16+).**
**14.00** «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Меладрама «Плюс Любоў» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Сэнс жыцця». Уладзімір Цеслер (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**21.00** Панарама.
**21.50** Клуб рэдактараў (16+).
**22.30 Меладрама «Мая ідэальная мама». 1—4-я серыі (12+).**
**2.20** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.15** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00** «Сакрэтны мільянер» (16+).
**11.00, 18.20 Серыял «Мароза-ва» (16+).**
**12.50 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**13.40** «ЖаннаПажані» (16+).
**14.35** «Вячэра не патрэбна» (16+).
**15.20** Хто я? (12+)
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.25 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.15** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Сага «Зорныя войны: эпізод III — Помста Сітхаў» (12+).**
**23.50 Драма «Ляўша» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Кішка.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** Гэты дзень.
**8.30, 18.40 «Людміла Гурчанка». Серыял (12+).**
**9.20, 16.55** «Дзесяць фатаграфій». Ігар Лівянаў (12+).
**10.00** «Артэфакты». Ломберны стол.
**10.30** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**10.45, 17.30 «Доўгія вёрсты вайны». Фільм трэці «На ўсходзе сонца», заключны (12+) [СЦ].**
**12.25, 21.05** «За адзін крок ад трэцяй сусветнай». Дак. драма (16+).
**13.15, 21.55 «1941». Серыял (12+).**
**14.50** «Сіла веры».
**15.15** «Я выбираю тебя!» Канцэрт Тарыела Майсурадзэ.
**19.30** «Камертон». Рэжысёр Галіна Адамовіч.
**20.00** «На вышыні». Вакаліст Яўген Курчыч.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.35** Дак. фільм «Адам. Жыццё чалавека». Фільм чацвёрты «Дзяды», заключны [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Чэмпіянат свету па водных відах спорту.
**9.40** II Еўрапейскія гульні. Мінск-2019.
**15.50** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. ХК «Мінск» — ХК «Рытм».
**17.25** Гульні «на выраст».
**18.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**18.35** Вось гэта спорт!
**18.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 14-ы тур. ФК «Слуцк» — «Нёман» (Гродна).
**20.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Норвіч» — «Саўтгэмптан». 2-і тайм.
**21.50** Спорт-цэнтр.
**22.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Манчэстэр Юнайтэд». (У перапынку Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.55** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Забойная сіла-6» (16+).**
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Сінія ночы» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 1.05** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.40, 18.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**18.50, 21.10** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** Вялікі гала-паказ да 100-годдзя Савецкага цырка (12+).
**23.35** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Летняя серыя гульняў (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Фірмовая гісторыя». Серыял (16+).**
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20, 1.25** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.00** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+).**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+).

## МІР

**6.00 Серыял «1942» (16+).**
**7.45** Дак. фільм «Усё для фронту. Усё для Перамогі» (12+).
**8.20, 10.10, 3.10 Серыял «Забыты» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «На вайне як на вайне» (12+).**
**15.10, 16.15, 19.25 Серыял «1943» (16+).**
**23.30 Серыял «Бліндаж» [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Таямніцы следства» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.00** «Дом культуры і смеху» (16+).
**23.10 Маст. фільм «Красуні» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** Спорт-мікс.
**6.20** Беларусы (6+).
**7.00, 16.25, 19.40, 21.50, 23.15** Сёння. Галоўнае.
**7.10** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** За секунду да подзвігу (16+).
**8.45 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.35** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга» (16+).**
**11.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Журналісцкае расследаванне» (16+).
**14.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**16.55** «ДНК» (16+).
**17.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.55, 22.25, 23.30 Баявік «Ультыматум» (16+).**
**21.55** «НЗ.by: Час вынікаў».
**0.25** «Вялікая вайна» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.50, 21.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** Мультпарад. «Рапунцэль» (6+).
**7.30, 15.55, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Драма «Стандарты прыгажосці».**
**8.30, 19.15 Серыял «Ленінград 46» (16+).**
**10.00** Дак. фільм.
**10.50 Драма «Уцёкі з Гулага» (16+).**
**13.30, 17.50 Серыял «Белая нявольніца» (18+).**
**14.50 Серыял «Каменнае сэрца» (18+).**
**16.15 Камедыя «Манекен».**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Дэтэктыў «Апошняя гульня» (16+).**
**0.20 Трылер «Мсціўцы» (12+).**
**2.50** «Надвор'е».





## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**10.00, 21.00** Серыял «Кухня» (16+).
**11.30** Серыял «Анжаліка» (16+).
**12.30, 22.55** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**13.55** «Ералаш» (6+).
**14.25** «Галілеа» (12+).
**15.00, 0.50** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**17.00** Серыял «Вароніны» (12+).
**19.00, 0.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.00** Серыял «Выжыць пасля» (16+).
**22.00** «Стэндап андэграўнд» (16+).
**2.30** «Хачу верыць!» (16+)
**3.45** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Лісты з правінцыі». Вялікі Ноўгарад [СЦ].
**7.00** «Легенды сусветнага кіно». Міхаіл Пугаўкін.
**7.35, 2.30** Жыццё выдатных ідэй. «Загадка Макінтоша» [СЦ].
**8.05, 13.20, 19.45** «Восем дзён, якія стварылі Рым». Дак. серыял [СЦ].
**8.50, 23.55** XX стагоддзе. «Я вяртаю ваш партрэт». Дак. фільм. 1983 год.
**10.00, 21.25** «Падарожжа Кэрал». Маст. фільм.
**11.40, 23.05** Оперныя тэатры свету з Уладзімірам Малахавым. «Нямецкая дзяржаўная опера».
**12.35** Academia. Сымон Шноль. «Біялагічныя гадзіны».
**14.05, 20.45** Штучны адбор.
**14.45** Спектакль Тэатра імя Уладзіміра Маякоўскага «Плён асветы».
**17.30, 1.00** Інструментальныя ансамблі. Вадзім Рэпін, Аляксандр Князеў, Андрэй Карабейнікаў.
**18.25** Колер часу. Васіль Паленаў. «Маскоўскі дворык».
**18.35** «Адлюстраваны час». Дак. серыял [СЦ].
**19.00, 1.50** Кіно пра кіно. «Застава Ільіча». Выпраўленаму не верыць». Дак. фільм [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. Led Zeppelin. 2004 год (18+).
**7.00** Маст. фільм «Ліст у Амерыку» (18+).
**7.15, 9.45, 11.00, 15.45, 17.00, 20.20, 21.45, 23.00, 3.45, 5.20** Музычная настальгія (12+).
**7.40** Маст. фільм «Пра цябе» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Пачатак перабудовы: «сухі» закон». 2006 год (18+).
**12.50** Маст. фільм «Вод-пуск, які не адбыўся» (16+).
**14.05** Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацццяняй Візбар. 2007 год (12+).
**19.00** Маст. фільм «Калі мне будзе 54 гады» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Таямніца Снежнай каралевы» (12+).
**2.20** Канцэртная праграма «Госці з Сан-Рэма». 1992 год (12+).
**4.00** «Вакол смеху» з Аляксандрам Івановым. 1985 год (12+).

## EuroSport 1

**0.00, 6.30** Матагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана» — 2018 (12+).
**1.00, 8.00** Матагонкі. FIM Endurance. Тэлечасопіс All Access (12+).
**2.30, 12.30** Снукер. «Мастэрс»-2019. Лондан (6+).
**6.00, 23.30** Матагонкі. «Боль д'Ор» — 2018 (12+).
**9.30** Тэніс. Агляд (6+).
**15.00** Веласпорт. «Тур Польшчы» — 2018 (12+).
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Нарвегіі (6+).

## Кінакамедыя

**0.50** Шчаслівы выпадак (16+).
**2.35** 2 + 1 (16+).
**4.40** Сняданак у таты (16+).
**6.20** Горка ў Мексіцы (18+).
**8.05** Аднакласнікі-2 (16+).
**10.00** У ложку з Вікторыяй (18+).
**11.55** Таткі без шкодных звычак (16+).



**13.50** Кабельшчык (16+).
**15.45** Сямейнае рабаванне (16+).
**17.25** Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі (12+).
**19.30** Суперстар (16+).
**21.10** Неверагодныя прыгоды Факіра (16+).
**22.55** Вампірскі засос (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** М/ф (6+).
**9.15, 17.35** «Сны» (16+).
**10.10, 15.30, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.10, 18.35** «Сляпая» (16+).
**12.15, 19.45** «Варажбітка» (12+).
**13.20, 3.40** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.20, 2.45** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.35, 3.15** «Знакі лёсу» (16+).
**20.55** «Менталіст». Серыял (16+).
**22.45** «Дубль два». Серыял (16+).
**23.30** «10 самых» (16+).
**0.05** «Лінія абароны» (16+).
**0.35** «Птушыны кораб». Маст. фільм (18+).

## ТБ1000

**6.10, 14.30** Таленавіты містар Рыплі (16+).
**8.50** Ілюзія падману-2 (12+).
**11.15** Ідэальныя ўцёкі (16+).
**13.00** Дзюплекс (16+).
**16.55** Знаёмцеся, Джо Блэк (16+).
**20.10** Аднакласнікі (16+).
**21.55** Аднакласнікі-2 (16+).
**23.40** Фрыда (16+).
**1.50** Вялікая гульня (18+).
**4.10** Паляўнічы за галовамі (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.05** Без меж (12+).
**9.10** Дзень выбараў (16+).
**11.45** Дзень выбараў-2 (12+).
**13.40, 19.45** Вольф Мессінг: хто бачыў скрозь час (12+).
**15.25** Царэўна-жабка (6+).
**16.05** Кіроўца для Веры (16+).
**18.05** Нябесны суд (16+).
**21.30** Мужчына з гарантыяй (16+).
**23.00** Жанчыны супраць мужчын (18+).
**0.30** Каханне ў вялікім горадзе (16+).
**2.15** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
**4.00** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
**5.30** Паддубны (6+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.40** Экстрэмальны экспрэс (16+).
**8.10** Суперкар са сметніка (16+).
**8.55** Ледзяная дарога (16+).
**9.40, 16.40** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**10.25** Асушыць акіян (+16).
**12.05, 15.10, 1.50** Аўта-SOS (16+).
**12.50** Астана: горад будучыні (16+).
**13.35, 21.15, 2.35** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**17.30** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**18.15, 22.00, 1.05, 4.05** Дзікі тунец (16+).
**19.45** Зямля пад рэнтгенам (16+).
**20.30** Секунды да катастрофы (16+).
**22.50** Востраў бунтароў (16+).
**3.20** Ліхтугі за мяжой (16+).
**4.55** Інжынерныя ідэі (16+).
**5.40** Зона будаўніцтва (16+).

## Discovery

**8.00** Перш за ўсё — самалёты (12+).
**8.45** Дальнабойшчык у В'етнаме (12+).
**9.35, 17.55, 2.40** Гаражныя рамонт (16+).
**10.25, 16.15, 22.10** Махінатары (12+).
**11.15, 18.45, 4.15** Багажныя войны (12+).
**12.05** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**12.55** Механізмы да Вінчы (12+).
**13.45** Ілюзіяніст (12+).
**14.35** Стальныя хлопцы (12+).
**15.25** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**17.05** Як гэта ўстроена: аўтамабілі мары (12+).
**17.30, 21.15, 5.00** Як гэта зроблена? (16+)
**19.35, 5.45** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**20.25** Роб Рыгл даследуе свет (12+).
**23.05** Паляўнічыя на склады (16+).
**0.00** Легендарныя месцы (12+).
**0.55** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**1.50, 6.30** Голыя і напалоханыя (16+).
**3.30** Сакрэтныя базы нацыстаў (16+).
**7.15** Узрываючы гісторыю (12+).

# І НЕ ГУБЛЯЙ!

## «Не біты, не фарбаваны». А калі наадварот?

Яшчэ адным цікавым аспектам пры куплі ў віртуальнай прасторы з'яўляецца фізічны стан тавару, інакш кажучы, наяўнасць дэфектаў ці слядоў папярэдняга выкарыстання. Так, былыя ў карыстанні рэчы таксама можна прадаваць праз сеціва. І тут існуюць свае правілы, абавязковыя для гандляроў.

— Пры рэалізацыі ў інтэрнэт-крамах былых у карыстанні тавараў, а таксама рэчаў, у якіх ліквідаваўся дэфект ці непасрэдна з ім (а часам і не адным), такая інфармацыя павінна быць даведзена да спажыўцоў разам з найменнем тавара на сайце інтэрнэт-крамы, — тлумачыць прадстаўнік МАРГ.

Гэтага патрабуюць Правілы продажу па ўзорах, зацверджаныя пастановай Саўміна ў 2009-м. У прыватнасці, яшчэ да моманту заключэння дамовы прадавец павінен давесці да пакупніка гэтую інфармацыю. Такое ж патрабаванне замацавана і ў законе «Аб абароне правоў спажыўцоў», дзе прапісана, што ў выпадку набыцця такога тавара звесткі аб наяўнасці недахопу павінны быць адлюстраваны ў дакуменце, які пацвярджае факт куплі. Пра што гаворка? Суразмоўніца тлумачыць, што такім дакументам з'яўляецца касавы цэтлік ці іншы плацежны дакумент у адпаведнасці з заканадаўствам.

— А калі ўсё ж такі прадавец сцвярджаў: «не біты, не фарбаваны», а на самай справе гэта не так і тавар набыты, што рабіць? — цікавімся мы.

Іна Гаўрыльчык звяртае ўвагу на тое, што пры рэалізацыі пакупніку былога ў карыстанні нехарчовага тавару неналежнай якасці, калі гандляр не паведаміў аб недахопах, пакупнік мае права на свой выбар прад'явіць патрабаванні, прадугледжаныя артыкулам 20 закона. Што за яны? Напрыклад, пакупнік мае права патрабаваць замяніць нядобраякасны тавар іншым таварам належнай якасці. Або суразмерна знізіць кошт сваёй пакупкі. Яшчэ можна патрабаваць неадкладна ліквідаваць недахопы тавару, канешне ж, бясплатна. Можна патрабаваць пакрыць выдаткі па выпраўленні недахопаў тавару. Акрамя таго, згодна з існуючым заканадаўствам спажывец мае права скасаваць дамову рознічнай куплі-продажу і патрабаваць вяртання сваіх грошай.

## Зазірніце ў Гандлёвы рэестр

Ці існуе алгарытм бяспечных пакупак у віртуальнай прасторы? Так, сцвярджае спецыяліст міністэрства і расказвае, як трэба купляць у інтэрнэце без шкоды для нерваў і сродкаў.

Перш за ўсё неабходна высветліць, ці зарэгістравана інтэрнэт-крама ў Гандлёвым рэестры нашай краіны, а яе даменнае імя — у нацыянальнай даменнай зоне .by, .бел — гэта галоўная ўмова існавання такога віду гандлю ў Беларусі. Каб праверыць рэгістрацыю віртуальнай крамы, дастаткова заглянуць на сайт Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю www.mart.gov.by

— Не купляйце тое, што прапануюць у сацыяльных сетках, — рэалізацыя тавару праз сацсеткі і месенджары недапушчальная, падкрэслівае Іна Анатолеўна.

Нарэшце, усе моманты высветленыя. Тавар набыты. На парозе кур'ер.

— Ён павінен перадаць тавар, якасць якога адпавядае ўзору, апісанню, размешчаным на сайце інтэрнэт-крамы, а таксама патрабаванням заканадаўства, — звяртае ўвагу суразмоўніца.

Акрамя таго, кур'ер абавязаны па патрабаванні пакупніка азнаёміць з дакументамі, якія пацвярджаюць якасць і бяспечнасць тавару (гаворка ідзе пра сертыфікат якасці, пасведчанне аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі і падобныя).

Разам з пакупкай кур'ер павінен выдаць неабходныя дакументы: тэхнічны пашпарт, інструкцыю па эксплуатацыі, гарантыйны талон, дзе пазначаны дата продажу, звесткі аб прадаўцу і сэрвісным цэнтры і пастаўлены подпіс прадаўца. Пасля дэманстрацыі працаздольнасці тавару абавязковы пункт — выдача цэтліка.

— Мы заўсёды рэкамендуем пры прыёмцы тавару звяртаць увагу на наяўнасць дэфектаў і праверку працаздольнасці, — раіць спецыяліст. — Супастаўляйце інфармацыю пра тавар і гандляра, размешчаную на сайце інтэрнэт-крамы, з інфармацыяй у дакументах на куплены тавар: загляніце ў тэхнічны пашпарт, гарантыйны талон. І зрабіць гэта трэба да таго, як ужо падпісаны акт прыёму-перадачы тавару і гарантыйны талон, тым больш да канчатковага разліку.

> Не купляйце тое, што прапануюць у сацыяльных сетках, — рэалізацыя тавару праз сацсеткі і месенджары недапушчальная.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### У тэму

## КОЛЬКАСЦЬ КРАМАЎ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ЎДВАЯ

**Зараз у Гандлёвым рэестры Беларусі зарэгістравана больш за 23 тысячы інтэрнэт-крамаў, якімі валодаюць як юрыдычныя асобы, так і індывідуальныя прадпрымальнікі.**

Прычым апошніх нават у большай ступені: на іх долю прыходзіцца 53 % ад усіх зарэгістраваных у Гандлёвым рэестры віртуальных крамаў. Астатнімі 47 % валодаюць юрыдычныя асобы.

Трэба таксама звярнуць увагу на агульную сусветную тэндэнцыю, якая датычыцца і нашай краіны: за апошнія пяць гадоў колькасць інтэрнэт-крамаў павялічылася амаль удвая — на 10 922 адзінкі.

Калі аналізаваць па тэрытарыяльным прынцыпе, найвялікшая іх частка зарэгістравана ў сталіцы — крыху менш за 15 тысяч адзінак, альбо 62,7 %. На другім месцы прысталічны рэгіён — у Мінскай вобласці зарэгістравана больш за 3,5 тысячы інтэрнэт-крамаў (15,4 %). На долю астатніх рэгіёнаў прыходзіцца ад 4 % да 6 %: у лідарах сярод іх Брэстчына, замыкае спіс Віцебшчына. Больш падрабязна глядзі ў нашай інфаграфіцы.



Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.

ВЫПРАБАВАНА НА САБЕ

# ШОПІНГУ

І ўсё ж праз тыдзень зноў трапіла ў псіхалагічную пастку анлайн-шопінгу. На сайце бясплатных аб'яў цяпер шукала самыя дарагія прапановы дзіцячага адзення, бо, палічыла, цана павінна адпавядаць якасці. Натрапіла на ўжываную курточку для дачкі. Прапанова з фота ў прадаўца з інтэрнэту: «рэч ношаная, але ў выдатным стане. Выбачайце, сучасны здымак зрабіць не магу, таму дасылаю аналагічны з сеціва». Прадавец патрабавала поўную перадаплату. Я пагадзілася, заплаціла 50 рублёў. Яшчэ пяць аддала за перасылку па пошце.

Пасылка прыйшла ў Гомель з Баранавіч. У пакунку ляжаў плашчык, які ўвогуле не падышоў па памеры. Да таго ж ён быў у шматлікіх плямах, падол, здаецца, увогуле перашываўся. Дачка нават мераць спачатку адмаўлялася. Потым апранула з нямым пытаннем у вачах: навошта мне такое? Я думала, што ж нарабіла. Ужо пралічвала: купіць плямавыводнік, а мо абрэзаць плашчык, каб плямы па нізе рэчы не кідаліся так у вочы? Потым пачытала на форумах: ці можна вярнуць грошы і адправіць пакупку назад адпраўніку. Больш як паўсотні каментарыяў людзей, якія спрабавалі вярнуць тавар, выносілі вердыкт — не! Хтосьці пісаў, што адпраўнік тэлефон назойлівага пакупніка дадае ў сеціве і сапсаваць яго рэпутацыю.

Сайт жа бясплатных аб'яў папярэджваў, што не нясе адказнасці за набыццё тавару, бо перад пакупкай у спажыўца ёсць магчымасць атрымаць падрабязную інфармацыю аб ім, можна загадзя дамовіцца аб вяртанні рэчы ці замене.

Я пратрымалася два дні, а потым патэлефанавала дзяўчыне — прадаўцу плашчыка. Вельмі спакойна растлумачыла: рэч з плямамі, здаецца, ад алею, мне непрыемна, што мы абедзве апынуліся ў няёмкім становішчы, аднак пакінуць рэч сабе не магу. Прапанавала аплаціць адваротную перасылку. Яна так жа спакойна пагадзілася і папрасіла ў мяне прабачэння. Грошы пераявіла на маю карту.

Дачка засталася без абноўкі, а я заплаціла двойчы за перасылку і ўпакоўку адваротнай пасылкі. На памяць засталіся толькі чэкі, якія цяпер, дарэчы, дапамаглі напісаць гэты артыкул. Ці хутка спакушуся зноў на танную і хітрамудрую прапанову ў сеціве?

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ЦІКАВАЕ ПЫТАННЕ

# «А НА МЕНШАЕ Я НЕ ЗГОДНЫ!»

## Ці можа інтэрнэт-крама вызначаць мінімальны кошт заказу?

**На сайце віртуальнай крамы размешчана інфармацыя для пакупнікоў аб мінімальнай суме заказу ў 30 рублёў. То-бок яна папярэджвае, калі сума будзе меншая, заказ не прымуць і, адпаведна, тавар не даставяць. Ці мае права гандляр на такія дзеянні? З гэтым пытаннем мы звярнуліся ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.**

Як высветлілася, такія дзеянні віртуальнага гандляра не стасуюцца з законам «Аб ахове правоў спажыўцоў» і Правіламі продажу тавараў па ўзорах. Згодна з законам спажывец мае права на свабодны выбар тавараў належнай якасці ў зручны для яго час з улікам рэжыму работы гандляра. Таксама заканадаўча забаронена абумоўліваць набыццё тавару абавязковым набыццём іншых тавараў.

Абмежаванні па суме пакупкі (у тым ліку ў інтэрнэт-краме), якія замацоўвае гандляр, супярэчаць гэтым нормам, паколькі абмяжоўваюць права спажыўца на свабодны выбар тавару па колькасці, а таксама прымушаюць спажыўца да заказу іншых тавараў, якія ён і не планаваў набываць.

Але ёсць адзін нюанс, і яго трэба ведаць. Гандляр (у тым ліку і віртуальны) мае права вызначаць умовы бясплатнай дастаўкі тавару. Напрыклад, пры набыцці тавараў на адпаведную суму (яе гандляр вызначае самастойна) яны дастаўляюцца спажыўцу бясплатна.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

ЗГОДНА З ЗАКОНАМ

## Аплата не толькі па картцы

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю выявіла парушэнні правоў спажыўцоў у вядомай інтэрнэт-краме.**

У ведамства звярнуліся грамадзяне, якія паскардзіліся, што аплаціць тавары, замоўленыя ў інтэрнэт-краме wildberries.by, наяўнымі грашыма немагчыма. Дзяржаўны рэгулятар убачыў у такіх дзеяннях таварыства з абмежаванай адказнасцю «Вайлдберыз» парушэнне Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў» і Правілаў продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання. Каб прадухіліць далейшае парушэнне правоў спажыўцоў, профільнае міністэрства выдала арганізацыі прадпісанне аб устараненні парушэнняў адпаведнага заканадаўства.

Аднак звароты грамадзян у міністэрства не супыніліся, інфармацыя на сайце гэтай інтэрнэт-крамы таксама сведчыла аб неналежным выкананні названага прадпісання.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, адказнасць за невыкананне (неналежнае выкананне) прадпісання дзяржаўнага органа прадугледжваецца артыкулам 23.1 КаАП Рэспублікі Беларусь, а адказнасць за парушэнне заканадаўства аб гандлі і ахове правоў спажыўцоў — артыкулам 12.17 гэтага ж кодэкса. Таму службовую асобу ТАА «Вайлдберыз» выклікалі ў профільнае міністэрства для складання пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

ТРЭБА ВЕДАЦЬ!

## Сацсеткі — не пляцоўка для гандлю

**Брастаўчанка хацела купіць абутак па аб'яве ў сацыяльнай сетцы, а ў выніку — страціла грошы.**

У аператыўна-дзяжурную службу Ленінскага РАУС Магілёва звярнулася 38-гадовая жыхарка Брэста, якая паведаміла, што невядомы малады чалавек падмануў яе ў інтэрнэце: ён паабяцаў жанчыне выслаць красоўкі, аб'яву аб продажы якіх размясціў у адной з сацсетак, аднак, як кажуць, ні абутку, ні грошай...

Як паведамілі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама, супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС Магілёва высветлілі, што да гэтага непрыемнага здарэння з брастаўчанкай, верагодна, мае дачыненне 19-гадовы раней асуджаны малады чалавек. Высветлілася, што хлопец у адной з сацсетак размясціў аб'яву аб продажы розных прадметаў гардэробу і абутку. Там ён пазіцыянаваў сябе як уладальнік інтэрнэт-крамы і за невялікія грошы абяцаў пераслаць мадэль спартыўнага адзення ці абутку ўсім, хто зацікавіўся ягонай прапановай. Жанчына трапіла на вуду спакусы і пераслала 92 рублі за модныя красоўкі, а калі малады чалавек перастаў адказваць на яе тэлефонныя званкі, звярнулася ў міліцыю. Той, безумоўна, і не збіраўся нічога ёй адсылаць, грошы ж выдаткаваў на ўласныя патрэбы. У адносінах да гора-гандляра ўзбуджана крымінальная справа, следчымі дадзена прававая ацэнка.

Між іншым, у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання нагадваюць інтэрнэт-карыстальнікам: не трэба купляць тое, што прапануюць у сацыяльных сетках — рэалізацыя тавару праз сацсеткі і месенджары недапушчальная.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

НА СЛЫХУ

# АЛЕЙ... З ДАСТАЎКАЙ ДА ДОМА

### Ва ўмовах каранавіруса пакупкі праз інтэрнэт пачалі карыстацца павышаным попытам

**А ў гэтым нешта ёсць. Сядзіш сабе на канапе, п'еш каву і разглядаеш тавар у інтэрнэт-краме. Тут табе і акцыі, і зніжкі, і бясплатная дастаўка, толькі не лянуйся, выбірай. І не трэба стаяць у чэргах, марнаваць і без таго дэфіцытны час, цягнуць на сабе непад'ёмныя сумкі, а галоўнае — ніякіх кантактаў з патэнцыйнымі пераносчыкамі віруса, тое, што ў сённяшняй абстаноўцы самае актуальнае.**

Сетка крам «Скрыжаванне» — адна са шматлікіх у Магілёве. І самая першая, якая выйшла са сваімі прапановамі ў інтэрнэт. Стваральнікі рэсурсу зрабілі гэта яшчэ некалькі гадоў таму «ў мэтах камфортнага і выгаднага набыцця харчовых тавараў». А зараз гэта яшчэ і самы бяспечны спосаб.

**Юрый БУРАЧЭЎСКІ, кіраўнік кампаніі ТАА «РольфТрэйд»**, расказвае, што колькасць інтэрнэт-спажыўцоў паступова павялічвалася, але менавіта каранавірус падштурхнуў людзей да больш актыўных інтэрнэт-пакупак. Дыстанцыйныя продажы павялічыліся ў параўнанні са звычайнымі прыкладна ў два разы. У сакавіку, напрыклад, заявак было столькі, што не хапала рук, каб усё сабраць, апрацаваць і даставіць у той жа дзень. Прыходзілася развозіць тавар назаўтра і нават напаслязаўтра.

— Зараз працуем у звычайным рытме — дзень у дзень, спраўляемся з той колькасцю, якая існуе. Штодня абслугоўваем ад 200 да 400 спажыўцоў, — удакладняе суразмоўнік. Самае цікавае, што сталі званіць з іншых краін, чаго раней не было, і заказваць тавар для сваіх родных з Магілёва.

У прыярытэце прадукты харчавання, бытавая хімія — адным словам, тавары першай неабходнасці. На ўра пайшла і распрацаваная спецыяльна пад эпідабстаноўку прапанова рабіць разлікі анлайн. Калі няма жадання кантактаваць нават з кур'ерам, можна скарыстацца магчымасцю зрабіць аплату праз сістэму АРІП. Хоць кампанія прадугледзела ўсё, каб абараніць пакупніка ад пагрозы інфіцыравання. Дастаўка працуе ў адпаведнасці з усімі супрацьэпідэміялагічнымі патрабаваннямі, змены паміж сабой не перасякаюцца і не кантактуюць. Сёння працуе адна група работнікаў, заўтра — другая. Паміж зменамі ўвесь інвентар, памяшканні і нават тавар дэзінфіцыруюцца, тое ж самае робіцца кожны раз, калі машына вяртаецца з рэйса. І, вядома ж, існуе прадпісанне абавязковага выкарыстання індывідуальных сродкаў аховы: масак, пальчатак, дэзінфекцыйных сродкаў. Новая змена пачынае рабочы дзень з чыстага ліста. Гэта яшчэ і клопат пра сваіх супрацоўнікаў. Калі нехта захварэе, у інфекцыі не будзе ніякіх шанцаў распаўсюдзіцца.

Паслуга па дастаўцы пакуль не выйшла за межы Магілёва, максімум — да найбліжэйшых прыгарадных вёсак. Але ў кампаніі разглядаюць варыянты далейшага развіцця.




Дыстанцыйныя продажы павялічыліся ў параўнанні са звычайнымі прыкладна ў два разы.

— Сэрвіс, безумоўна, запатрабаваны, будзем працаваць над яго пашырэннем,— абяцае Юрый Анатолевіч. — Гэты канал продажу меў рост і раней, а эпідабставіны сталі своеасаблівым каталізатарам. Тыя людзі, якія лічылі, што няма зручна рабіць заказы праз тэлефон, мабільную праграму або камп'ютар, паспрабавалі і ацанілі. Калі абстаноўка стабілізуецца, напэўна, адбудзецца спад інтэрнэт-продажаў, але агульны трэнд — рост гэтага канала застанецца. Ён ніколі не заменіць афлайн-продажы — стацыянарныя крамы, таму што гэта і нейкая своеасаблівая забава — пахадзіць, паглядзець, памацаць рукамі. Інтэрнэт-стасункі гэтага не заменяць, але, калі табе спадабаўся тавар і ты яго набываеш пастаянна, навошта траціць час на гэтую працэдуру.

У сакавіку, з пачаткам неспрыяльнага перыяду, народ аддаваў перавагу сацыяльным таварам. Куплялі на запас рыс, макарону, муку, алей.

— Аб'ёмы продажаў той жа грэчкі ўзраслі прыкладна ў тры разы, — кажа суразмоўнік. — Але дэфіцыту не ўзнікала, запасы аператыўна аднаўляліся. А хутка і ажыятаж спаў. У нас паменела пакупнікоў, але павялічылася сума сярэдняга чэка. Людзі сталі хадзіць радзей, але пачалі купляць больш. Калі раней чалавек пасля работы ішоў спачатку ў краму, а потым дадому, то цяпер робіць гэта праз дзень-два. Таму і падзенне чэкаў адбылося на 20-30 %. Выручка крыху паменшылася, але неістотна. У нас праце звыш тысячы чалавек, і першасная задача, якая стаіць перада мной як кіраўніком, забяспечыць работнікаў зарплатай, каб яны маглі падтрымаць свае сем'і.

У пачатку пандэміі, як высветлілася, узрос попыт не толькі на грэчку, рыс і іншыя стратэгічна важныя прадукты, але і на тую ж бытавую тэхніку. Як сведчыць **спецыяліст па маркетынгу Магілёўскага ААТ «Універмаг «Цэнтральны» Ірына ГАЎРУШКА**, народ купляе анлайн халадзільнікі, тэлевізары, мэблю, не кажучы ўжо пра тэкстыль, адзенне, цацкі, касметыку.

> Самае цікавае, што сталі званіць з іншых краін, чаго раней не было, і заказваць тавар для сваіх родных з Магілёва.

— З самага пачатку інтэрнэт-крама была тэрыторыяй нізкіх цэн, — кажа яна. — Там пастаянна праводзіліся акцыі, рабіліся зніжкі. А ў красавіку мы запусцілі бестэрміновы сацыяльны праект, які гарантуе 25%-ную зніжку для пастаянных пакупнікоў — уладальнікаў дысконтных картак. Яе, дарэчы, можна таксама замовіць праз інтэрнэт. У нас яны на любы густ — для пенсіянераў, навасёлаў, шматдзетных сем'яў, ёсць нават картка з адным з банкаў, якая дае права на зніжку 5 %.

Часцей за ўсё інтэрнэт-паслугамі Цэнтральнага універмага карыстаюцца пакупнікі ва ўзросце ад 28 гадоў да 52, але хапае людзей і больш сталага ўзросту. Тавар можна не толькі набыць, але і атрымаць з дастаўкай на дом. Калі пакупнік з Магілёва, дастаўка абыдзецца яму ў пяць рублёў. Але тавар могуць завезці і ў любы пункт Беларусі.

На сайце можна ўбачыць, што ёсць прапановы і для пакупнікоў з Расійскай Федэрацыі. Тавар дастаўляецца кур'ерскай службай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва ТАА «РольфТрэйд» і Магілёўскага ААТ «Універмаг «Цэнтральны».**

**Намеснік начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага гарвыканкама Галіна ЯСКЕВІЧ:**

— Зараз сэрвіс, які дазваляе замаўляць тавар праз інтэрнэт, асабліва запатрабаваны. Людзі больш робяць акцэнт на бяспеку. Яны пачынаюць разумець, што гэта цалкам прымальны варыянт. Ён выклікае давер і карыстаецца павышаным попытам. Не трэба кудысьці ехаць на грамадскім транспарце, марнаваць час, рызыкаваць здароўем — усё, што ад цябе трэба, гэта ўключыць камп'ютар і выбраць. Перавагі відавочныя. Мы, са свайго боку, кантралюем работу інтэрнэт-крамаў на прадмет таго, каб у іх была ўся дакладная інфармацыя для пакупнікоў, каб прэйскуранты вытрымліваліся. Кантроль такі ж самы, як і за стацыянарнымі крамамі. Калі будуць паступаць сігналы, што нехта там не выконвае рэкамендацыі, будзем прыцягваем да адміністрацыйнай адказнасці. Але пакуль такіх зваротаў не было. Значыць, уладальнікі інтэрнэт-крамаў забяспечваюць і якасць, і своечасовасць дастаўкі, і цэны адпавядаюць тым, што заяўленыя на іх сайтах. Пакупнікі ўжо бяруць не толькі нейкія дробязі, але, напрыклад, і бытавую тэхніку. Большасць інтэрнэт-крамаў, якія працуюць у Магілёве, маюць сталічную прапіску, але ў нас паступова развіваецца і свой, магілёўскі, інтэрнэт-гандаль.

# КАНКРЭТНЫ ВЫНІК І БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ...

## Чым карысна асабістая ініцыятыва, як нараджаюцца законы і чаго не хапае звычайнаму дэпутату

**Начальнік Магілёўскага інстытута МУС генерал-маёр міліцыі Валерый ПАЛІШЧУК чалавек рознабаковых інтарэсаў. На любую тэму ў яго абавязкова знойдзецца прыклад з жыцця. Бо па родзе сваёй дзейнасці ён якімі толькі праблемамі ні займаўся. І хоць дэпутатам стаў упершыню, вопыт работы з насельніцтвам мае вялікі. Прафесія міліцыянера наогул чымсьці пераклікаецца з дэпутацкімі паўнамоцтвамі. У абодвух выпадках неабходна займацца абаронай інтарэсаў грамадзян.**


Фота з архіва Магілёўскага інстытута МУС.

### Трэба быць прыкладам

— Люблю канкрэтны вынік і не цярплю фармалізму, — кажа ён. — Калі нешта абяцаюць, але не робяць, гэта мяне абурае. Да любога чалавека трэба ставіцца з павагай. У душы кожны з нас чымсьці незадаволены. Аўтобус спазніўся, злуёмся, трэба ў чарзе пастаяць, таксама пачынаем «качаць» правы. Але мы павінны разумець, што нічога гладка ў жыцці не бывае, дзесьці трэба пачакаць, пацярпець. У маёй практыцы было шмат выпадкаў, калі прыходзілася ўрэгулёўваць канфліктныя сітуацыі. З людзьмі трэба размаўляць, кім бы яны ні былі. А яшчэ важна пазбягаць стэрэатыпаў і глыбей унікаць у сутнасць справы. Вось, напрыклад, прыехалі ў Мсціслаў некалькі ўкраінцаў, просяць зямлі, каб займацца ўласнай справай. А чаму б і не? Трэба даваць магчымасць працаваць ініцыятыўным людзям, каб іншыя бралі прыклад. Мае бацькі паехалі ў свой час асвойваць казахстанскія стэпы. Бацька ўсё жыццё ганарыўся медалём за пад'ём цаліны, які яму Леанід Брэжнеў уручыў. Людзі мэтанакіравана ехалі туды, дзе цяжэй, бо ведалі, што робяць гэта для сваіх нашчадкаў. І імёны дзецям давалі з сэнсам, а не так, як зараз, для прыгажосці. Напрыклад, мяне назвалі ў гонар Валерыя Быкоўскага, які якраз паляцеў у космас, калі я нарадзіўся. Гэта была традыцыя, у гонар найлепшых называць. Каб было потым з каго браць прыклад. Вось і дэпутат павінен быць чалавекам, з якога іншым хацелася б браць прыклад.

### Пра ролю дэпутатаў

Як член пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, Валерый Палішчук актыўна ўдзельнічае ў заканатворчасці. Інстытут, якім кіруе, лічыцца адным з вядучых у краіне па навуковай дзейнасці. У штаце шмат выкладчыкаў з навуковымі ступенямі, на рахунку некаторых з іх запатэнтаваныя распрацоўкі, прымяненне якіх дазваляе істотна знізіць колькасць злачынстваў. Ледзь не з першага курса ў навуковую дзейнасць уцягнуты і курсанты. Яны дэманструюць вельмі высокі ўзровень ведаў у міжнародных алімпіядах і навукова-даследчых конкурсах. Што датычыцца навуковай дзейнасці ВНУ цесна супрацоўнічае амаль з трыццаццю падобнымі ўстановамі Расіі, краін СНД і далёкага замежжа. Да пагаршэння эпідстановкі інстытут рэгулярна прымаў дэлегацыі ад сваіх замежных партнёраў або дэлегаваў сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў разнастайных канферэнцыях і семінарах. Зараз гэтыя сустрэчы не прыпыніліся, але перайшлі ў анлайн-фармат. Валерый Палішчук таксама паклапаціўся, каб усе пытанні, якія падымаюцца ў парламенце, уважліва вывучаліся і абмяркоўваліся і ў сценах інстытута.

— Цяпер практыкуюцца сумесныя з Саветам Рэспублікі канферэнцыі анлайн, — расказвае сенатар. — На адной з іх мы нядаўна абмяркоўвалі палажэнні Грамадзянскага кодэкса аб інтэлектуальнай уласнасці. З нашага боку ўдзельнічала некалькі кандыдатаў навук. А на мінулым тыдні адбыўся круглы стол анлайн, на якім абмяркоўвалі рэалізацыю закона «Аб нарматыўных і прававых актах». Удзел бралі рэктары, кандыдаты навук, прафесары. Адны выступаюць з дакладамі, астатнія аналізуюць. У заканатворчасці задзейнічана шмат людзей, прыцягваецца вялікая колькасць экспертаў. Адзін голас там нічога не вырашае. Напрыклад, калі прымалі Закон «Аб амністыі ў сувязі з 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў», абмяркоўвалі кожны нюанс. Галоўнае, каб у спіс датэрмінова вызваленых не трапілі тыя, хто асэнсавана здзяйсняў злачынствы. Памятаю, як аднойчы да мяне падышоў бацька наркагандляра з абурэннем, што яго сын наркотыкі не ўжываў, а толькі распаўсюджваў, а яму за гэта 8 гадоў далі. За што, маўляў? А тое, што малады чалавек рабіў грошы на чужым горы, яго не хвалявала. А бывае, што на лаву падсудных трапляе чалавек, які апынуўся, як той казаў, не ў тым месцы і не ў той час. Ён сабе толькі дрэнна зрабіў і ўжо сто разоў пашкадаваў пра гэта. Чаму ж яго не вызваліць датэрмінова?

### Дабрачыннасць перш за ўсё

Мсціслаў, Дрыбін і Горкі — гэта тыя акругі, у якіх працуе сенатар. Акрамя рэгулярных прыёмаў грамадзян, інстытут міліцыі з лёгкай рукі Валерыя Палішчука пачаў шэфстваваць над спецыяльнай агульнаадукацыйнай школай-інтэрнатам для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы ў Мсціславе, над Мацюцкім яслямі-садам у Горацкім раёне і шматдзетнай сям'ёй Жукавых у Дрыбіне. Гэта значыць, што да ўсіх свят і не толькі тут могуць разлічваць на салодкія падарункі і дапамогу. Дзеці з нецярпеннем чакаюць да сябе ў госці курсантаў з іх канцэртамі. А для сям'і з Дрыбіна сюрпрызам стаў набыты за кошт уласных сродкаў інстытута МУС музычны цэнтр.

— Калі нешта аддаеш, сам атрымліваеш ад гэтага задавальненне, — кажа Валерый Палішчук. — Асабліва, калі дапамога адрасаваная дзецям. У Магілёве мы таксама апякуем спецыялізаваны Дом дзіцяці. Да свят заўсёды прывозім цукеркі і розныя падарункі. Месяц таму завезлі ім некалькі скрынь цацак, посуд, фарбы для касметычнага рамонту, дыванкі. Для кожнага, хто працуе ў нашым ведамстве, справа гонару прыйсці на дапамогу ў цяжкай сітуацыі. Асабліва, калі гэта датычыцца праблем са здароўем. Ніводны афіцэр не адмовіцца ўнесці колькі грошай у агульную скарбонку, нават курсанты ўбаку не застаюцца. Дапамагаем і сваім, і іншым. Калі наша ведамства ў сувязі з каранавірусам аб'явіла акцыю «Міліцыя медыкам», мы адразу ж далучыліся. Курсанты і супрацоўнікі сабралі звыш 1,6 тысячы рублёў, каб перадаць у Магілёўскую інфекцыйную бальніцу і гарадскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі.

Асабліва для мяне вельмі важна, каб і супрацоўнікі, і курсанты былі здаровыя. Таму мы адразу ж пасля аб'яўлення неспрыяльнай эпідстановкі ў краіне ўвялі строгія меры прафілактыкі. Гэта абавязковая дэзынфекцыя рук і абутку на ўваходзе ў ВНУ, маскі, бяспечнае дыстанцыяванне, анлайн-лекцыі.

### Скаргі таксама бываюць розныя

Прыходзіцца генералу займацца і такімі жыццёвымі пытаннямі, як падсыпка дарог, прыватызацыя нерухомасці, нават змагацца з браканьерствам. Адным словам, унікаць ва ўсе тыя пытанні, якія насельніцтва ставіць перад народнымі абраннікамі. І не рэдкасць, калі на прыёмы прыходзяць адны і тыя ж людзі, заўважае суразмоўнік. Вось толькі адзін прыклад. Пажылая жыхарка атрымала на пошце перавод і дзесьці згубіла тыя грошы. Яна заняла пазіцыю, што грошай не бачыла і подпіс на чэку не яе, а касіра. Прайшла праверка, зрабілі экспертызу чэка, абвінавачванні пенсіянеркі не пацвердзіліся. Але яна з таким адказам не пагадзілася і пачала скардзіцца далей, у больш высокія інстанцыі. Была прызначана яшчэ адна экспертыза, за якую ёй прыйшлося аддаць вялікую суму грошай. Вынікі зноў былі не на яе карысць, але гэта жанчыну не пераканала. Калі Валерый Палішчук праводзіў у Мсціславе свой першы ў якасці сенатара прыём грамадзян, пенсіянерка паспяшалася зноў вырашыць сваё пытанне. Як высветлілася, гэтай скарзе ўжо пяць гадоў. Хоць бывае, што людзям даюць сапраўды фармальныя адказы. Як гэта было з адной жанчынай, якая хацела памяняць вокны. Высветлілася, што ёй танней было спачатку прыватызаваць дом і мяняць вокны на правах уласніцы жылля. Складанасць была ў тым, што дом стаяў на балансе калгаса, а не банка, як усе лічылі. І сума прыватызацыі аказалася не такой вялікай, як меркавалася. Жанчына нарэшце вырашыла сваё пытанне, хоць гэта магло адбыцца значна раней. Проста сенатар аднёсся да справы як вопытны праваахоўнік, для якога справа гонару дакапацца да самай сутнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА СНИЖЕНА НА 80 ПРОЦЕНТОВ)

**Организатор электронных торгов (продавец):** Открытое акционерное общество «Нафтан», Витебская область, г. Новополоцк, +375214598257.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 14.07.2020** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота (без учета НДС), бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|
| Комплекс капитальных строений (изолированных помещений) и движимого имущества. Витебская область, Полоцкий район, Боровухский с/с | Тепличный комплекс, обеспечивающий с соблюдением технологического температурного и светового режимов выращивание в защищенном грунте и предпродажное хранение плодоовощной продукции, включая автономную выработку тепловой энергии:<br>250/С-37773: здание специализированное растениеводства, общая площадь 42601,4 кв. м<br>250/D-36952: помещение коммунального хозяйства, общая площадь 965,4 кв. м<br>250/С-36362: здание административно-хозяйственное, общая площадь 927,3 кв. м<br>250/С-41205: здание специализированное трубопроводного транспорта, общая площадь 9,5 кв. м<br>250/С-36440: здание специализированное автомобильного транспорта, общая площадь 509,9 кв. м<br>250/С-37569: сооружение специализированное складов/хранилищ, площадь застройки 717 кв. м<br>250/С-35602: сооружение специализированное складов/хранилищ, площадь застройки 289 кв. м<br>250/С-43022: сооружение многофункциональное (дороги и площади), наружная площадь 6990 кв. м<br>250/С-41136: сооружение неустановленного назначения (забор из ж/б панелей, забор кирпичный, забор из сетки рабицы, забор из колючей проволоки, трое ворот), протяженность 864,4 м<br>250/С-41207: сооружение специализированное трубопроводного транспорта (газопровод среднего давления, протяженность 322,1 м<br>250/С-43023: сооружение специализированное энергетики (электроосвещение), протяженность 834,6 м<br>250/С-41206: сооружение специализированное энергетики (низковольтные сети электроснабжения ГРП 0,4 кВ), протяженность 25,0 м<br>Движимое имущество (155 единиц основных средств и 264 наименования товарно-материальных ценностей) | 2 069 001,99 | 103 500,00 | Информация о предыдущих торгах опубликована в газете «Звязда» от 19.03.2019 № 51 (28918) и от 24.04.2019 № 77 (28944), от 30.11.2019 № 228 (29095) |

Правоустанавливающие документы на земельный участок и в отношении составляющих предмет торгов капитальных строений (изолированного помещения), а также рекламно-информационные сведения на русском, английском и китайском языках размещены на интернет-сайте http://gvozdovo.naftan.by.

Победитель торгов (претендент на покупку) помимо оплаты стоимости предмета торгов оплачивает налог на добавленную стоимость (НДС) по ставке 20 процентов.

Возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости входящих в состав предмета торгов капитальных строений (изолированного помещения). Условия предоставления рассрочки приведены на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

Для использования под тепличное хозяйство продавцу на праве постоянного пользования передан земельный участок с кадастровым номером 223881401601000039 площадью 10,8567 га.

**Представление информации о предмете торгов:** Бехунов А.В., +375333980719.

**Осмотр предмета торгов:** Жогалев С.Н., +375333980866; Бохан С.В., +375333980622.

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 08.07.2020, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Сроки возмещения затрат на организацию и проведение торгов:** победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.

Срок подписания договора купли-продажи капитальных строений (изолированного помещения) – не позднее 20 рабочих дней со дня возмещения затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов. Победитель (единственный участник) торгов оформляет в установленном законодательством Республики Беларусь порядке право пользования (право постоянного пользования или аренда) земельным участком.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| Продавец | **ОАО «Экран»,** Минская область, г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167 | |
| **Предмет аукциона** Месторасположение: г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167/1-3 | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Изолированное помещение № 3 столовой** | 1505,1 кв. м | 610/D-43567 |
| ***Дополнительная информация по объекту:*** не используется в хозяйственной деятельности ОАО «Экран», расположено на 2-м этаже здания | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 152 280,00 бел. руб.** (снижена на 10 %) | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.04.2020 | | |
| **Дата и время проведения аукциона: 30.06.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.06.2020 до 17.00** по указанному адресу | | |

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Общество с ограниченной ответственностью «ИПМ-Консалт оценка»,** организующее электронные торги на основании договора поручения, извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **обществу с ограниченной ответственностью «Волес Юнион» (УНП** 192022460**)**, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 600-26Б/2019 в экономическом суде города Минска

| | |
|---|---|
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – дебиторская задолженность**

| № лота | Кредитор | Дебитор | Сумма дебиторской задолженности | Начальная цена (без НДС) | Минимальная цена (без НДС) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ООО «Волес Юнион» | ООО «АРКАДИЯ-ТЕКС» (г. Москва, пр. Мира, д. 131, оф. 3, ОГРН 5137746157621, ИНН 7717770567, КПП 771701001) | 4 817 865,00 рос. руб. | **3 372 505,50** рос. руб. (снижена на 30 %) | **963 573,00** рос. руб. |
| **2** | ООО «Волес Юнион» | ОАО «Смиловичская валяльно-войлочная фабрика» (УНП 600011780) | 51 135,95 бел. руб. | **35 795,18** бел. руб. (снижена на 30 %) | **10 227,19** бел. руб. |

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

Имеющиеся обременения в отношении имущества: отсутствуют

Задаток **10 %** (по лоту № 1 – по курсу НБРБ на дату платежа) от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)»**

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 5 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 19.05.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 30.06.2020 в 09.00. Окончание торгов – 30.06.2020 в 16.00** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.06.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**


«ЧЫСТАЯ ВАДА» БЕЗ МЕЖ

# КРЫНІЦЫ ЖЫЦЦЯ...

## У Гомельскім раёне адкрыліся новыя станцыі абезжалезвання

**Больш за дзве тысячы жыхароў сельскай мясцовасці будуць забяспечаны вадой, якая адпавядае ўсім санітарна-гігіенічным нормам. Аб'екты высокай сацыяльнай значнасці рэалізаваны па праграме «Чыстая вада» дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», разлічанай на 2016—2020 гады.**



Фота БелТА.

Станцыі абезжалезвання з'явіліся ў Раманавічах і Клімаўцы. Патрэба ў такіх аб'ектах у гэтых населеных пунктах была відавочная. Так, напрыклад, да з'яўлення станцыі ў Раманавічах колькасць утрымання жалеза ў вадзе перавышала норму ў 3-4 разы. Мясцовыя жыхары шукалі дапамогі ў вырашэнні праблемы ў кіраўніцтва раённага жыллёва-камунальнага прадпрыемства. Спецыялісты, у сваю чаргу, чысцілі сеткі, што дапамагала, але толькі на кароткі час. Цяпер пытанне да якасці вады больш не ўзнікне ў месцічаў у наступныя 20 гадоў.

— Станцыя ў Раманавічах ачышчае 14 кубаметраў вады ў гадзіну. За месяц атрымліваецца больш за 5 тысяч кубаметраў. Гэтага дастаткова не толькі каб забяспечыць вёску чыстай вадой, але і каб стварыць пэўны рэзерв, — адзначыў на адкрыцці новага аб'екта **дырэктар КЖУП «Гомельскі райжылкамгас» Яўген ПЛЕСКАЧЭЎСКІ.**

Цяпер да станцыі падключана 655 дамоў з цэнтральным водазабеспячэннем. Гэта значыць, што больш за 1300 жыхароў сельскай мясцовасці пачалі атрымліваць з кранаў якасную пітную ваду.

— Мы ўжо пакаштавалі ваду, яе якасць істотна палепшылася. Гэта нават відаць па працэсе прыгатавання ежы: на посудзе няма такога накіпу, як раней, — расказаў жыхар Раманавіч Аляксей Салаўёў.

Дарэчы, ужо цяпер пралічваецца варыянт: калі абанентамі водаправода ў Раманавічах стане большая колькасць вяскоўцаў, то магчыма будзе зрабіць яшчэ адну свідравіну для забеспячэння людзей вадой.

Між тым станцыя абезжалезвання, што прынесла чыстую ваду жыхарам другога населенага пункта — Клімаўкі, — мае ачышчальную прадукцыйнасць 10 кубаметраў вады ў гадзіну.

З рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў на будаўніцтва аб'екта ў Раманавічах было накіравана амаль 173 тысячы рублёў, у Клімаўцы — амаль 155 тысяч. Пры ўзвядзенні выкарыстоўваліся матэрыялы і абсталяванне айчыннай вытворчасці.

**Старшыня Гомельскага райвыканкама Алена АЛЕКСІНА** расказала, што ў раёне 14 аграгарадкоў і 60 сельскіх населеных пунктаў забяспечана цэнтральным водазабеспячэннем:

— Варта адзначыць, што не ўсюды ёсць магчымасць забяспечыць якасць пітной вады. Менавіта такія сучасныя станцыі абезжалезвання, якія адпавядаюць санітарным патрабаванням і нормам, маюць неабходнае тэхнічнае абсталяванне, дазваляюць даставіць спажыўцу чыстую якасную ваду, — падкрэсліла кіраўнік раённай «вертыкалі» ўлады.

Яна звярнула ўвагу на тое, што ў цэлым цяпер на тэрыторыі Гомельскага раёна працуе 13 станцый абезжалезвання. Штомесяц пры іх дапамозе ачышчаецца 72 тысячы кубаметраў вады.

Летась у Гомельскім раёне былі ўведзены ў эксплуатацыю пяць станцый абезжалезвання. Да канца бягучага года будуць пабудаваныя яшчэ два аб'екты. Яны з'явяцца ў населеных пунктах Грабаўка і Маркавічы. Будаўніцтва пяці станцый запланавана на наступны год.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ЭКАНОМІКА

# ЁСЦЬ ІДЭІ? ГРОШЫ БУДУЦЬ!

## Прафінансуюць сацыяльна значныя ініцыятывы

**Еўрапейскі Саюз і ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам эканомікі краіны падтрымаюць кластарныя і сацыяльна значныя ініцыятывы ў 12 раёнах краіны.**

Усім, хто жадае развівацца ў прадпрымальніцтве, прапануюць паўдзельнічаць у конкурсе ініцыятыў па праекце «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Фінансавая падтрымка будзе выдзяляцца па двух тэматычных кірунках — кластарных ініцыятывах і сацыяльна значных ініцыятывах.

Пад першымі маецца на ўвазе арганізацыя сумеснай дзейнасці тэрытарыяльна лакалізаваных юрыдычных і фізічных асоб з намерам стварыць кластар, накіраваны на развіццё і ўзмацненне канкурэнтаздольнасці яго ўдзельнікаў. А сацыяльна значная ініцыятыва — гэта комплекс мер па падтрымцы дзелавой ініцыятывы для вырашэння якой-небудзь сацыяльнай праблемы, развіцця інклюзіі або пашырэння падтрымкі сацыяльна ўразлівых груп.

Пілотнымі рэгіёнамі сталі Бярозаўскі і Кобрынскі раёны ў Брэсцкай вобласці, Браслаўскі і Аршанскі ў Віцебскай, Брагінскі, Жлобінскі і Хойніцкі ў Гомельскай, Лідскі ў Гродзенскай, Барысаўскі і Маладзечанскі ў Мінскай і Быхаўскі, Клічаўскі раёны ў Магілёўскай вобласці.

Сёлетні прыём заявак праводзіцца ў электронным выглядзе з 5 чэрвеня да 31 ліпеня ўключна на сайце конкурсу (https://www.prospring.by/). На падтрымку найлепшых кластарных ініцыятыў Еўрасаюз накіруе 1,44 мільёна долараў, а бюджэт для прадпрыемстваў, накіраваных на вырашэнне сацыяльна значных праблем, складзе 1,8 мільёна долараў.

«Намі будуць падтрыманы ініцыятывы, рэалізацыя якіх дасць эканамічны, сацыяльны і экалагічны эфект. Бізнес-ідэі павінны быць актуальныя для той тэрыторыі, дзе плануецца іх увасабленне. Спадзяёмся, што прапанаваная падтрымка будзе спрыяць аднаўленню эканомікі рэгіёнаў у няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі», — растлумачыла **дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК.**

А **кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Дзірк ШУБЕЛЬ** выказаў надзею, што фінансаванне ініцыятыў не толькі дапаможа ў пераадоленні сацыяльных і эканамічных наступстваў пандэмічнага ўдару, але таксама паспрыяе вырашэнню доўгатэрміновых праблем найбольш уразлівых груп грамадства і малых і сярэдніх прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца асновай эканомікі.

«Ініцыятывы, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны быць накіраваны на вырашэнне канкрэтных задач рэгіянальнага развіцця Беларусі. Яны павінны спрыяць устойліваму эканамічнаму росту мясцовасці, магчымасці мець годную работу, забеспячэнню гендарнай роўнасці, дапамагаць лічбавізацыі і інавацыям. Мы чакаем ад заяўнікаў нестандартных падыходаў да вырашэння задач у галіне развіцця з выкарыстаннем новых метадаў, ідэй і прадуктаў», — падкрэсліла **пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Аляксандра САЛАЎЁВА.**

**Сяргей КУРКАЧ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 11 чэрвеня 2020 года.**